Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся

Савецкая Беларусь

Органа Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

10 год выданьня.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 209 (2698) Пятніца, 13-га верасьня 1929 г.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапаракі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапаракі перад тэкстам 1 р. — к. За радок шапаракі перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазволены. Зьмена тарыфу бароцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант 35 кап. За кожны дадатковы 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант 15 „ За кожны дадатковы 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, на ўсіх аддаленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

54 кр. "Савецкая Беларусь" Одесса, Пастера 13, государ. стан. публічн. библиотека. стуль. экз. адзін экз.

Палепшыць гаспадарчае кіраўніцтва.

Усім ходам гаспадарчай палітыкі высунута на першы плян пытаньне аб палепшаньні арганізацыі вытворчасьці і кіраваньня гаспадаркаю, пытаньне аб забясьпечаньні цьвёрдага парадку і моцнай унутранай дысцыпліны на вытворчасьці. Без правільнай арганізацыі вытворчасьці, без мэтавогдна арганізаванага і моцна спаянага кіраваньня гаспадаркаю нельга пасьпяхова вырашаць складаныя задачы тэхніка-эканамічнай рэканструкцыі, пастаўленыя перад намі. Няма патрэбы таварыць аб вялікіх нашых дасягненьнях у справе гаспадарчага будаўніцтва. Яны ўсім вядомы. Але калі недастатковы дасягненьні ў справе выкананьня намечаных яскасных паказальнікаў, калі недастатковы дасягненьні ў справе зьніжэньня сабекошту прадукцыі, дык пэўную долю віны прыходзіцца шукаць у неўпарадкаваньні нашай арганізацыі вытворчасьці, у наяўнасьці буйных дэфэктаў у сыстэме кіраваньня гаспадаркаю.

Партыя даўно абвясьціла і праводзіць прынцып адналачальнасьці. Тэарэтычна гэта пытаньне для пралетарскай дыктатуры высьветлена канчаткова. Цэлы шэраг пастаноў вышэйшых партыйных органаў—зьездаў і канфэрэнцый—з поўнай катэгарычнасьцю гаворыць аб гэтым. Аднак на практыцы пытаньне аб забясьпечаньні цьвёрдага і ўстойлівага кіраваньня гаспадаркаю не зьяўляецца вырашаным. Да гэтага часу прыходзіцца яшчэ канстантаваць адсутнасьць выразнага разьмежаваньня функцый паміж кіруючымі органамі на прадпрыёмстве. Усё яшчэ ў шэрагу выпадкаў няма дастатковага ўпарадкаваньня ў рабоце гэтых органаў.

Трыкутнік—адміністрацыя, ячэйка і завком—дзейнічаюць зараз недагаворана. Альбо прыходзілася і прыходзіцца назіраць умешваньне ячэйкі і мясцкому ў апэрацыйна-вытворчую работу на прадпрыёмстве з абмежаваньнем правоў і абавязкаў адміністрацыі. Ці, з другога боку, назіралася і назіраецца з боку гаспадароў бюракратычнае ігнараваньне заводскай грамадзкасьці, ігнараваньне практычнай работы і ініцыятывы рабочых і задачы іх набліжэньня і ўцягненьня ў сацыялістычнае будаўніцтва. З гэтым можна і павінна скончыць.

Калі ў параўнаньні з папярэднімі гадамі значна ўзрасьлі гаспадарчыя кадры са складу рабочых, палепшылася іх дзелавая кваліфікацыя, павялічылася іх тэхнічная пісьменнасьць, а гэта дае магчымасьць сапраўды, на практыцы, па ўсяму фронту гаспадаркі ўстанавіць цьвёрдую гаспадарку, устанавіць цьвёрдую аднаначальнасьць. Вялізарнае значэньне пастановы ЦК партыі «аб мерах упарадкаваньня кіраваньня вытворчасьцю і ўстанаўленьня аднаначальнасьці» з таго і складаецца, што яна ва ўвесь рост ставіць гэту задачу перад партыйнымі, гаспадарчымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі і выразна зазначае шляхі і мэтады практычнага правядзеньня яе ў жыцьцё. Гэта пастанова павінна быць самым дзейным чынам разабрана і вывучана шырокімі масамі рабочай клясы. Нельга недаацэньваць значэньня гэтага дакуманту.

Якая асноўная ўмова правільнага вырашэньня задачы забясьпечаньня ўстойлівага і цьвёрдага кіраўніцтва ў нашай гаспадарцы? Адказ можа быць толькі адзін. Асноўнай умовай вяўляецца тое, каб цьвёрдая ўлада адміністратара злучалася з сталёвым няўхільным удзымам ініцыятывы і актыўнасьці рабочых мас, каб няўхільна разгортваўся іх удзел у гаспадарчым будаўніцтве, каб яны ўцягваліся ў кіраваньне вытворчасьцю. Толькі такі курс ёсьць курс да сацыялізму, ёсьць курс да безклясавай грамады. Савецкаму адміністратару, дырэктару прадпяўляюцца ня толькі звычайныя ўмовы веданьня даручанай справы, даваньня выразных і правільных дырэктыў, уменьня растаўляньня людзей. Савецкі гаспадарчы працаўнік павінен быць яшчэ і грамадзкім працаўніком.

Вялізарнае прынцыповае значэньне для далейшай работы мае пункт пастановы ЦК партыі, які гаворыць аб тым, каб „у відзе вопыту назначаць на некальких прадпрыёмствах старшынь вытворчых нарад, на час іх выбарнасьці, памоцнікамі дырэктараў спэцыяльна па рэалізацыі рашэньняў вытворчых нарад і камісій і прапаноў рабочых». Гэтаю пастановаю робіцца надзвычайна важны крок у справе поўнага скарыстаньня рабочых прапаноў у інтарэсах вытворчасьці, у справе магчымага поўнага і своечасовага правядзеньня іх у жыцьцё. Трэба каб рабочыя прапановы ў рабочай дзяржаве былі арганічнай складанай часткай усяго сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта трэба зразумець, уявіць і безагаворачна праводзіць у жыцьцё. Зразумела, у рабоце адміністрацыі, завкому і ячэйкі павінна быць пагоджанасьць, упарадкаванасьць. Усе яны павінны імкнуцца да таго, каб яшчэ больш узьнімаць актыўнасьць рабочых, яшчэ шырэй разгортваць іх ініцыятыву вакол кантрольных лічбаў і пяцігодкі.

Шырокія масы рабочых павінны быць арганізаваны ў барацьбе за далейшыя посьпехі гаспадарчага будаўніцтва, у барацьбе за генэральную лінію партыі. Пастанова ЦК дае, такім чынам, аснову і плян работы для нізавых органаў савецкай грамадзкасьці і савецкага гаспадарчага кіраўніцтва. Гэтыя органы абавязаны ў найкаротшы тэрмін перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з гэтымі дырэктывамі. Правядзеньне ў жыцьцё пастановы ЦК павінна паслужыць рычагом далейшага прасоўваньня ўперад. Яна павінна прывесьці да значна большых дасягненьняў у галіне зьніжэньня сабекошту і павышэньня агульнай якасьці работы. Неабходна ўзмацніць увагу да жыцьця, да работы асноўных нізавых зьвеньняў фабрычна-заводзкіх арганізацый.

„Правда".

У апошні час.

(Адтрымана а 1-ай гадзіне ўночы.

Ангельскі ўрад адправіў ноту ўраду СССР.

ЛЁНДАН, 12-IX. Ангельскі ўрад адправіў савецкаму ўраду ноту, у якой выказвае гатоўнасьць распачаць перамовы па пытаньні аб аднаўленьні дыплёматычных зносін.

Становішча нанкінскага ўраду нятрывалае.

ГРАШОВЫЯ ЦЯЖКАСЬЦІ, НЕЗДАВОЛЕНАСЬЦЬ ШЫРОКІХ МАС КІТАЙСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ДРАПЕЖНАЙ ПАЛІТЫКАЙ ЧАН-КАЙ-ШЫ.

Белагвардзейцы наглеюць.

ТОКІЁ, 11-IX. Дальне-Ўсходні расейска-нацыянальны камітэт у Харбіне выпусьціў адозву з заклікам да барацьбы супроць СССР і да зьнішчэньня савецкіх грамадзян. На левым беразе Сунгары ўладай знойдзен склад зброі, які прыналежыць белагвардзейцу Белаусаву і ён карыстаўся ім як спальным вагонам.

Тым ня менш вызначэньне гэтага складу паслужыла кітайскай паліцыі прычынай дзеля масавых арыштаў сярод савецкіх служачых, прычым склад завецца „Складам камуністычнай зброі".

Чан-Кай-Шы ўвесь час хістаецца.

ТОКІЁ, 11-IX. Добра інфармаваныя асобы, якія зьвярнуліся з Шанхаю, зазначаюць, што становішча нанкінскага ўраду ў сучасны момант зьяўляецца выключна нятрывалым. Па думцы гэтых асоб, ў нанкінскага ўраду няма пэўнай палітыкі па пытаньні аб КУ чыгунцы, і ён увесь час хістаецца.

Чан-Кай-Шы знаходзіцца пад пагрозай каліцыі Ен-Сі-Шана, Фын-Юй-Сяна і Чжан-Сюэ-Ляна, а з другога боку і яму пагражаюць гуансійцы. Нарэшце, нанкінскі ўрад перажывае вялікія фінансавыя цяжкасьці.

Дызэртыры ў кітайскай арміі.

ГОКІЁ, 11-IX. „Дэмпа-Цэйпін" паведамляе з Харбіну, што на ст. Пагранічная пануе поўная анархія. Адсюль у непарадку ідуць кітайскія салдаты, якія адступаюць на напрамку да Мюліну. Вялізарная колькасьць дызэртыраў.

Японія „дапаможа".

ТОКІЁ, 11-IX. Газэта „Цзі-Цзі" паведамляе, што былы старшыня пэйпінскай палітычнай рады Чан-Чы, які знаходзіцца ў Японіі з неафіцыйнай місіяй, наведаў японскага міністра замежных спраў Ідэхару і заявіў яму, што Японія, дзейнічаючы супольна з Амэрыкай, павінна дапамагчы Кітаю дамагчыся экстарытарыяльных правоў і ўстанавіць мытавую аўтаномію.

Як паведамляе газэта, Ідэхара ў адказ выразіў гатоўнасьць дапамагчы Кітаю.

НА ЖЭНЕЎСКАЙ ГАВАРЫЛЬНІ.

КІТАЙСКІ ДЭЛЕГАТ „ПРАПАНУЕ".

ЖЭНЕВА, 10-9. На пасяджэньні пленуму Лігі Нацый кітайскі дэлегат У-Чжао-Чу выступіў зноў з прамоваю, у якой падрабязна разьвіў выказанае ім у першай сваёй прамове заявы на жаданьне прымяненьня 19 артыкулу статуту Лігі Нацый, прысьвечанаму пытаньню аб пераглядзе дагавораў. (Артыкул 19 гаворыць: сход можа часад-часу запрашаць членаў Лігі Нацый прыступіць да новага разгляду дагавораў, якія зрабіліся няўжытнымі, а таксама міжнародных становішчаў, захаваньне якіх магло-б падвясьці да небясьпекі ўсеагульны мір).

У-Чжао-Чу прапанаваў аб утварэньні Лігай спэцыяльнага камітэту дзеля „вылучэньня лепшых мэтадаў дапасаваньня 19 артыкулу". Матывіруючы сваю прапанову, У-Чжао-Чу занова распаўсюджваўся «аб клапотах Кітаю, аб міры дзеля ўсяго сьвету», „супрацоўніцтве народаў" і г. д. Пры гэтым У-Чжао-Чу выразіў жаль, што 19-ты артыкул ніводнага разу ня ўжываўся за 10 год і падкрэсьліў, што кітайская дэлегацыя прапануе ня зьмену статуту Лігі Нацый, а ажыцьцяўленьня яго.

„Дэлегаты,—заявіў У-Чжао-Чу,—гаварылі аб удасканаленьні мэханізму, які дапамог-бы перашкодзіць распаўсюджаньню пажару, калі ён зьяўляецца ў якой-небудзь частцы сьвету. Прапанова кітайскай дэлегацыі мае сваёй мэтаю прыняцьце захадаў, якія-б зрабілі немагчымым выбуху самаго пажару. Адхіленьне прычын канфлікту гэтак важна, як і вывучэньне спосабаў адхіленьня вайны, у выпадку здарацца якія-небудзь канфлікты.

Пастановы верасьнёўскага пленуму выканаем.

Сход Менскага гарадзкога партактыву аднагалосна адобрыў працу верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б, ухваліў пастановы пленуму і будзе іх праводзіць у жыцьцё.

ВЫНІКІ ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б

(З дакладу т ГАМАРНІКА на сходзе Менскага партактыву ад 11-IX 1929 г)

Пленум ЦК КП(б)Б працаваў з 5-га па 8-ае верасьня і разабраў 5 пытаньняў. 4 з гэтых пяці пытаньняў ахапілі суму гаспадарчых праблем на 1929-30 год.

Пятае пытаньне—вынікі праверкі і чысткі партыі, зьявілася вузлом усіх пытаньняў, таму што тут абгаварывалася аб узмацненьні партыі, якая кіравала і будзе кіраваць сацыялістычным будаўніцтвам.

Вынікі бягучага 1928-29 году гаворыць аб тым, што ва ўсім СССР абганяем тэмп намечаны пяцігодкай. Мы значна за гэты год узмацнілі сацыялістычны сэктар, узмацнілі вытворчую змычку рабочае клясы з сялянствам. Ня гледзячы на цяжкасьці з хлебам, мы добра справіліся з гаспадарчымі задачамі. На падставе гэтага можна канстантаваць, што мы разьбілі ўсе погляды правых, усе настроі Бухарына і бухарынцаў. Бухарынцы нам прапанавалі скласьці замест пяцігадовага пляну—2-хгадовы, яны ня верыць у рэальнасьць пяцігодкі і спадзяваліся, што двухгодка дакажа нерэальнасьць пяцігодкі. Кантрольныя лічбы мінулага году поўнасьцю абверглі іх тэорыю.

У далейшай частцы дакладу т. Гамарнік пералічае дасягненьні ў вытворчых плянах наступнага году. Ён гаворыць, што партыя ўзьняла вакол ленінскай лініі—гаспадарчага будаўніцтва актыўнасьць шырокіх колаў, рабочых, батракоў, беднаты і серадняцтва. Лінія індустрыялізацыі, вынікі гэтага году паказалі, што рабочая кляса разам з бядняцка-серадняцкай масай сялянства, пад кіраўніцтвам кампартыі пабудуе сабе новае жыцьцё. Вынікі гэтага году пераканалі ўсіх працоўных, што мы здольны дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны, бо будаўніцтва ідзе з гэткім тэмпам, які ня быў ні ў воднай капіталістычнай краіне ў самым распале ўздыму.

Мы зараз маем моцнае кулацкае супраціўленьне, але яму процістаіць узьняты энтузіязм рабочае клясы і бядняцка-серадняцкай масы.

Тав. Гамарнік пералічае рост фактараў вытворчай змычкі, як кантрактацыя, каапэраваньне, калектывізацыя і прамысловасьць і пералічае слабыя месцы ў будаўніцтве прамысловасьці і сельскай гаспадаркі.

Зазначаючы на рост бюджэту, дакладчык падкрэсьлівае дапамогу в боку саюзнага ўраду. У справе сацыялістычнага спаборніцтва, якое зьяўляецца магутным фактарам уздыму гаспадаркі, мы яшчэ не дабіліся належнага кіраўніцтва прафсаюзаў і партыі. Калі ў далейшым так будзе, дык для нас складаецца небясьпека, узьняты энтузіязм пойдзе на зьніжэньне.

Пленум адзначыў аб неабходнасьці далейшага разгортваньня сацыялістычнага сэктару. Асноўнае зьвяно, за якое мы павінны моцна ўзяцца—гэта калектывізацыя. Улічваючы, што машына-трактарныя калёны будуць зьяўляцца галоўным фактарам калектывізацыі і хоць у Саюзе ёсьць райёны, якім больш патрэбны трактары, мы аднак ставім пытаньне перад саюзным урадам аб дастаўцы нам трактараў. Пленум вызначыў пашырэньне прамысловасьці на 60 проц.

Для выкананьня ўсіх задач нам патрэбен апарат, які праводзіць чоткую клясавую лінію. Да гэтага часу некаторыя нашы ўстановы выконвалі сацыяльны заказ нашага клясавага ворага (НКЗ, Саматужна - прамысловы саюз) Наркамзем ішоў па сьлядох Сталыпіна. Мы зьнялі з працы наркома, выключылі з партыі Лабаноўскага. Але гэта мала. Нам патрэбна перарабіць усю яго працу. Зьмяніць вымельны кодэкс і нормы. У нас ёсьць навуковыя інстытуты па сельскай гаспадарцы, дасьледчы інстытут і сельска-гаспадарчая акадэмія, але там няма нашай лініі, нашых людзей.

Бюро ЦК вырышыла пытаньне аб шэфстве гарадзкіх ячэек над калгасамі, якія ў нас адыгрываюць значнавялікую ролю чымся ў Саюзе.

Уся гэта група гаспадарчых пытаньняў вырышана пленумам, які намеціў нашу лінію па сацыялістычнаму будаўніцтву, па рашучаму наступленьню на капіталістычныя элемэнты.

Адсюль будзе і абвастраньне клясавай барацьбы. 1929-30 г.—гэта адрэз эпохі абвастраньня клясавай барацьбы да якой мы павінны быць гатовы. Кулак паліць калгасы, савгасы, парыцца выкарыстаць усе нашы слабыя месцы, імкнуўся выкарыстаць пытаньне чысткі партыі дзеля яе кампрамэнтацыі. Нашаму клясаваму ворагу нават удалося захапіць некалькі зьвеньняў Беларускай саматужнай прамысловай каапэрацыі. Апошні пленум спэцыяльна займаўся гэтым пытаньнем, таму што гэты від каапэрацыі ў нас адыгрывае вялікую ролю, а таксама таму, што шэраг звеньняў яго знаходзіліся ў руках клясавага ворага.

Для разьвязваньня ўсіх пытаньняў была праведзена і будзе праводзіцца праверка і чыстка партыі. Да пленуму ёсьць вынікі чысткі вясковых, вайсковых ячэек і кіруючых кадраў. З вынікаў можна адзначыць наступнае: з вясковых ячэек вычышчана 17 проц. У Віцебскай вясковай арганізацыі было 4 проц. кулакоў. Мала ўцягнута беднаты і амаль зусім няма батракоў у вясковых арганізацыях. Гэта сьведчыць аб слабасьці нашай працы ў вёсцы. Намечаныя 13 проц. калектывізацыі, як вялікая задача, патрабуе ўцягненьня беднаты ў партыю. Усе разам кажуць, што нам патрэбна пераглядзець нашу працу ў вёсцы. Аб гэтым ЦК будзе абгаварваць у хуткім часе.

Асноўным партыйным пытаньнем у сучасны момант у Беларусі зьяўляецца пытаньне аб кадрах. Праверка і іншыя матар'ялы паказваюць, што частка нашых кадраў ня здольна праводзіць чоткую клясавую лінію, весьці за сабой партыйную і працоўную масу. Пленум намеціў мерапрыёмствы па замене няздольных работнікаў, па вылучэньні новых кадраў з рабочых, новых кадраў з ліку камсамольскіх працаўнікоў, якія патрэбны ў Беларусі. Беларусі, як краіне, дзе ёсьць моцны націск дробнай буржуазіі, кадры патрэбны азабліва цьвёрдыя. Нацыянальны пераплет Беларусі патрабуе моцных і цьвёрдых кадраў у галіне культурнага будаўніцтва. Аб гэтым паказала і дыскусія па тэатральнаму пытаньню, дзе частка камуністаў ішла з нацыянал-дэмакратамі.

Партыя ў далейшым павінна расьці за лік рабочых, батракоў і беднаты. Гэта вырашыць пытаньне аб пралетарскіх кадрах.

У справе росту партыі за лік рабочых у нас кепска. Віцебская парт-арганізацыя мае прамысловы цэнтр, а прыняла за паўгода толькі 190 рабочых у партыю. Менская арганізацыя расьце хутчэй, але тут ёсьць слабыя бакі. Мне вядома ячэйка чыгуначнікаў, дзе за ўвесь час прыняты ў партыю толькі адзін чорнарабочы.

Яшчэ горш з ростам камсамолу за лік рабочых. У гэтым годзе камсамол зьнізіў процант росту за лік рабочых. Пленум завастрыў увагу усёй партыі на гэтыя моманты.

Усе нашыя задачы будуць ажыцьцёўлены пры рашучай барацьбе з усялякімі ўхіламі і з іх канкрэтнымі насіцелямі. На даным этапе галоўнай небясьпекай для партыі зьяўляецца правы ўхіл. Але ёсьць і небясьпека левага. Усялякія ўхілы, гэта форма націску буржуазіі і гэтыя формы могуць зьмяняцца. Трацкісцкая апазыцыя разьбіта дашчэнту, хоць рэшткі яшчэ могуць быць. Правая апазыцыя разьбіта кантрольнымі лічбамі, лічбамі нашых дасягненьняў. Нам патрэбна партыя моцная без усялякіх хістаньняў.

Пленум ЦК паставіў пытаньне перад ЦК УсеКП(б), каб апошні патрабаваў ад бухарынскай апазыцыі адмовіцца ад сваіх поглядаў, таму, што адстайваць свае погляды цяпер пасьля даведзенай праваты партыі значыцца стаць у шэрагі другой клясы. Бязьлітасную барацьбу з правым ухілам на фронце ідэалёгічным, на фронце практычным, быць на варце супроць абуджэньня левых заскокаў прыкладам якіх можна лічыць выступленьні т. т. Стэна і Шацкіна. Шырэй мабілізаваць партыю, рабочую клясу, батрацтва і серадняцтва вакол гаспадарча-палітычных задач—вось задачы сёньняшняга дню.

Для мабілізацыі масы нам трэба яшчэ больш разгарнуць бязьлітасную бальшавіцкую самакрытыку. Можна сказаць, што выпадкі апашленьня самакрытыкі, якія былі ў мінулым годзе ў нас, зараз амаль няма. Самакрытыка ўзьнята на прынцыповую вышыню, але недастаткова разгорнута. Аб прынцыповасьці паказала праверка кіруючых кадраў, дзе працоўная маса ўдзельнічала і прынцыпова крытыкавала.

Пытаньне аб інтэлігенцыі,—кажа тав. Гамарнік,—зьяўляецца ў нас актуальным пытаньнем. Мы заяўляем усім сумленным інтэлігентам,—калі будзеце выконваць нашы задачы, мы дамо вам усе палітычныя і матар'яльныя магчымасьці для працы. Калі-ж інтэлігенты зробяць спробу выконваць сацыяльны заказ нашага клясавага ворага, мы бязьлітасна іх будзем адкідваць ад нашага будаўніцтва.

Апошні момант—кажа т. Гамарнік—гэта разам з павышэньнем якасных паказчыкаў усёй працы, павысіць якасныя паказчыкі партпрацы. Парткомам ня трэба займацца дробнымі штодзённымі пытаньнямі ўстаноў, а больш улучыць увагі прынцыповаму кіраўніцтву усёй працай, рашучай барацьбой з усялякімі клясавымі прарывамі.

У спрэчках па дакладу выступілі т. т. Фрыдман, Мар'ясін, Галавач, Эпштэйн, Чэлядзінскі, Шапіра, Іракумовіч.

У прынятай рэзалюцыі актыў са здавальненьнем падкрэсьліў рост сацыялістычнага сэктару і правільнасьць лініі ЦК. Актыў аднагалосна адобрыў працу пленуму і пастанавіў вывучыць гэтыя пастановы і праводзіць іх у жыцьцё.

Паражэньне аўстрыйскага ўраду.

ЛЁНДАН, 11-IX. Водлуг паведамленьняў з Канбэры, аўстрыйскі ўрад пацярпеў паражэньне ў парлямэнце пры абгаварэньні законапраэкту аб скасаваньні фэдэральнага арбітражнага суду, які разглядае канфлікты паміж прадпрыёмцамі і рабочымі. На скасаваньне арбітражнага суду настойвалі прадпрыёмцы. Пры некаторых канфліктах арбітражныя рашэньні прадугледжвалі пазначныя ўступкі патрабаваньням рабочых, тады як прадпрыёмцы настойвалі на поўным адхіленьні гэтых вымаганьняў.

За законпраэкт галасавалі нацыяналісты (партыя, якая прадстаўляе інтарэсы прамысловага і банкавага капіталу). Супроць законпраэкту супярэчыла рабочая партыя. Галасы дэпутатаў сельска-гаспадарчай партыі падзяліліся. (Сельска-гаспадарчая партыя ўваходзіла ў урадавую каліцыю, але ў яе шэрагах выяўляюцца разнагалосьсі, з прычыны супярэчнасьці інтарэсаў буйных і дробных фэрмэраў). Законапраэкт адхілен большасьцю 35 супроць 34 галасоў. Прэм'ер Брус мяркуе распусьціць парлямант і назначыць і новыя выбары ў другой палове кастрычніка.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ МАКДАНАЛЬДА.

ЛЁНДАН. Агентства „Рэйтэр" паведамляе: „выступаючы ў Бэргскай акрузе, Макдональд адхіліў чуткі аб разнагалосьсях у габінэце.

Спыніўшыся на англа-амэрыканскіх перамовах, Макдональд заявіў: „я аптыміст, як і заўсёды быў. Магутнасьць грамадзкай думкі настолькі вялікая, што не магу дапусьціць, каб мы маглі пацярпець няўдачу. Мы не заключаем саюзаў з Амэрыкай, якая надта мудрая, каб заключыць саюзы з якой-небудзь эўрапейскай дзяржавай. Я буду аптымістам да канца (якога пакуль-што ня відаць) і ня буду ім толькі ў тым выпадку, калі вынікі перамоваў прывядуць да краху і прымусяць нас сказаць, што праблема не вырашыма".

Кажучы далей аб нядаўнай канфэрэнцыі ў Гаазе, Макдональд заявіў: «мне здаецца, што іншыя дзяржавы ўжо пачалі разумець, што Англія ня будзе весьці сумленнай гульні, калі іншыя гэтага ня будуць рабіць. Дзеля таго, каб быў захаваны мір у Эўропе, мы як людзі, якія паважаюць іншых і карыстаюцца павагай, павінны былі заняць у Гаазе тую пазіцыю, якую мы занялі.

Пераходзячы да пытаньня аб становішчы ў вугольнай прамысловасьці, Макдональд сказаў: „мае быць выданьне законаў, якія закрануць вугольную прамысловасьць". Мы ня хочам, каб новае законадаўства дало-б страту прамысловасьці. Наадварот, мы хочам дапамагчы прамысловасьці. Мы ставім за лепшае, каб новы выгляд прамысловасьці зьявіўся без дапамогі звонку, бо пры гэткіх абставінах новае законадаўства будзе больш карысным, чымся пры іншых умовах».

АНТЫ-САВЕЦКІ ХАРАКТАР „ПАН-ЭЎРОПЫ".

НЬЮ-ЁРК, 11-IX. Жэнеўскі карэспандэнт „Чыкага Дэйлі Ньюс" падкрэсьлівае, што брыянаўскія пляны „пан-Эўропы" носяць яўны анты-савецкі характар. Брыян, праўда, заявіў у гутарцы з журналістамі, што СССР зможа далучыцца пасьля да „Пан-Эўропы", але, утачняя сваю праграму на налажаным ім сьнеданьні, Брыян, гаварыў, што „неабходна аб'яднаньне капіталістычных дзяржаў Эўропы супроць СССР".

* * *

НЬЮ-ЁРК, 11-IX. Амэрыканскі друк адносіцца з вялікім скэптызмам да высунутага Брыянам пляну «пан-Эўропы». Газэты адзначаюць, што супярэчнасьці паміж эканамічнымі інтарэсамі паасобных эўрапейскіх краін асуджаюць гэткія пляны на бясплоднасьць

Клясавая барацьба за межамі.

ФАШЫСТЫ АРГАНІЗАВАЛІ НАПАД НА РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ РАБОЧЫХ.

НЬЮ-ЁРК, 11-IX. Некалькі сот фашыстаў, пад кіраўніцтвам чыноўнікаў гастонскай паліцыі і прадстаўнікоў адміністрацыі гастонскіх тэкстыльных фабрык, зрабілі напад на памяшканьне левых прафсаюзаў у Гастоніі і Бэсэмэр-Сіці, а таксама на памяшканьне камітэту абароны гастонскіх тэкстыльшчыкаў (якіх абвінавачваюць у забойстве начальніка паліцыі) у Шарлоце.

У Шарлоце яны захапілі трох прафсаюзных дзеячоў, адвезьлі іх за горад і вызвалілі. Нападаўшыя пагражалі лінчаваць усіх трох, але вымушаны былі вызваліць іх, бо пабаяліся прахадзіўшай недалёка групы паляўнічых, якая зьвярнула ўвагу на крыкі зьбіваемых.

Трэба адзначыць, што фашысты шукалі і пагражалі лінчаваць камуністаў Дэна і іншых работнікаў камуністычнай партыі, дзеячоў левага прафсаюзу тэкстыльшчыкаў і абаронцаў па працэсу гастонскіх тэкстыльшчыкаў.

У Бэсэмэр-Сіці банды нападаючых прымусілі левы прафсаюз тэкстыльшчыкаў адмяніць назначаны мітынг, пагражаючы лінчаваць усіх прамоўцаў, абаронцаў гастонскіх тэкстыльшчыкаў і трох жанчын, якія знаходзяцца ў ліку абвінавачаных па гэтаму працэсу. Вызваленыя з рук фашыстаў прафсаюзныя дзеячы **назвалі ўладзе імёны кіраўнікоў нападу**, тым ня менш **ніхто** з тых, хто нападаў **не арыштаваны.**

ХЛЕБА І ПРАЦЫ.

ВАРШАВА, 10-9. Як паведамляе „Газэта Варшаўска" у Атвоцку на вуліцы Карчэўскай сабраўся натоўп рабочых-пекароў мясцовых і прыезджых з Варшавы і Фаленіцы. Натоўп павялічваўся вельмі хутка, сабралася звыш 200 асоб. Стаўшы ў калёны, рабочыя рушылі да гарадзкой пекарні ў Атвоцку. Дэманстранты крычалі: **„Патрабуем хлеба і працы"**. На чале дэманстрантаў ішоў студэнт, вядомы як камуніст. Недаходзячы да цэнтральнай гарадзкой пекарні 100 мэтраў, на дэманстрантаў напала паліцыя пешая і конная, якая прыкладамі і бізунамі разагнала дэманстрантаў.

4 ДЗЕНЬ ПРАЦЭСУ Ў ТЭМЭШВАРЫ.

Поўная кампрамэнтацыя „сьведкі" Пэр'яна.

ВЕНА, 9-9. Як паведамляюць з Румыніі, 4-ы дзень працэсу румынскіх камуністаў у Тэмэшвары быў прысьвечаны допыту начальніка паліцыі Пэр'яна, якога пракуратура хацела выкарыстаць у якасьці галоўнага сьведкі абвінавачаньня. Пэр'ян, які распачаў свае доказы з цяжкіх абвінавачаньняў супроць падсудных, галоўным чынам, супроць старшыні рады унітарных прафсаюзаў Мюлера і сэкратара прафсаюзаў харчавікоў Крэбса, канчаткова запутаўся ў супярэчнасьцях, калі абарона ўзяла яго пад крыжавы допыт.

Так, на пытаньне абароны аб тым, у якім менавіта месцы былі зроблены барыкады, аб якіх расказваў у сваіх показах Пэр'ян, сьведка не знайшоў нічога лепшага, як зазначыць, што барыкады знаходзіліся «ззаду» рабочых. Гэткія бязглуздныя адказы ён даваў на далейшыя пытаньні абаронцаў. Прысуд чакаецца 11-12 верасьня.

СПРАВА СУПРОЦЬ „РОТЭ ФАНЭ".

БЭРЛІН, 9-9. У «Ротэ Фанэ» апублікавана афіцыйнае паведамленьне вайсковага міністэрства аб тым, што яно распачало справу супроць „Ротэ Фанэ" і «Ахт Ур Абэн Блят". З прычыны меркаваньня, якое выказана абедзьвума газэтамі аб дачыненьні рэйхсвэру да выбухаў бомб у Люнэбурзе.

АРЫШТ ТЭРАРЫСТАЎ-БАМБІСТАЎ.

БЭРЛІН, 11-IX. Агенства Вольфа паведамляе: „у сувязі з апошнімі замахамі тэрарыстаў-бамбістаў, паліцыя арыштавала ў Бэрліне Цэхава, які ў 1922 годзе быў прысуджан да 4 год турэмнага зьняволеньня за ўдзел у забойстве міністра замежных спраў (забіт у 1922 г. фашыстамі, якія былі не здаволены яго палітыкай зьбліжэньня з Антантай) Ратэнаў.

Паліцыя арыштавала таксама кіраўніка аднэй з правых крайніх арганізацый Вэрнэра Ласа, пісьменьніка Саламена і доктара Золінгера ў якога пражываў Саламен. Усе 4 асобы арыштаваныя ў Бэрліне знаходзіліся ў цеснай сувязі з асобамі, арыштаванымі ў Гамбурзе і Шлезвізе. Водлуг вестак газэт, арыштаваныя належылі да нацыяналісцка-анархісцкай тэрарыстычнай партыі, у якую ўвайшлі былыя члены арганізацыі „Консул" (фашысцка-тэрарыстычная).

Газэта „Ландфольк", орган кулацкага руху ў Шлезвуг-Гольштэйне, які выступае супроць сучаснай сыстэмы ўпраўленьня, забаронен за артыкул вельмі правага напрамку".

* * *

БЭРЛІН, 12-9. Агенства Вольфа паведамляе: „Лічба асоб, якія арыштаваны ў сувязі з апошнімі замахамі тэрарыстаў-бамбістаў, дасягнула зараз 22 чалавек. Паліцэй-прэзыдэнт Бэрліну паведамляе, што канфіскаваны ў вялікай колькасьці матар'ял в упэўненасьцю выяўляе, што асобы, якія арыштаваны ў Бэрліне знаходзіліся ў цеснай сувязі з арыштаванымі ў Шлёзвіг-Гельштэйне.

СУТЫЧКА ПАЎСТАНЦАЎ З ВОЙСКАМ.

ПАРЫЖ, 12-IX. Агенства Гавас паведамляе з Рабату (Марока): „у выніку сутычкі францускага атраду з паўстанцамі Бу-Дэніб забіта 22 стралкі, з іх двое французаў.".

БАНДЫЦКІ НАСКОК.

НЬЮ-ЁРК, 10-9. Зроблен наскок на памяшканьне левага прафсаюзу ў Бэсэмэры (Гастонія). Налётчыкі зьнішчылі літаратуру, якая знаходзілася ў прафсаюзе і жорстка пабілі 3-х кіраўнікоў саюзу.

У наскоку ўдзельнічала некалькі сот членаў рэакцыйных арганізацый.

НОВЫ ЦЭНТР ПРАФРУХУ АМЭРЫКІ.

МАСКВА, 4-9. Выканбюро Прафінтэрну атрымала ад амэрыканскай лігі праф. прапаганды паведамленьне аб выніках працы кангрэсу лігі. Утворан новы цэнтр рэвалюцыйнага прафруху Амэрыкі.

Кангрэс, між іншым, абгаварыў пытаньне аб абароне СССР і прыняў рашэньне аб пасылцы ў СССР рабочай дэлегацыі. Кангрэс прыняў рэзалюцыю аб далучэньні да Ціхаакіянскага сэкратарыяту прафсаюзаў і да Прафінтэрну.

Ліст Прафінтэрну аб праграме і ўстанове лігі прафпрапаганды ўхвален аднагодна.

Аб кантрольных лічбах народнай гаспадаркі і культуры БССР на 1929-30 год.

Даклад тав. ГАЛАДЗЕДА на верасьнёўскім пленуме ЦК КП(б)Б*).

На будучы год тэмп росту сацыялістычных элемэнтаў узмацняецца.

Канкрэтны плян будаўніцтва на наступны год вызначаецца наступнымі кэмпамі па асноўным паказчыкам кантрольных лічбаў. У галіне сельскай гаспадаркі мы вызначаем пашырыць пасеўную плошчу на 4 проц. У бягучым годзе, як я вам ужо паказаў, па пляну вызначалася пашырыць пасеўную плошчу на 3 проц., але мы недавыканалі гэтае заданьне на 1 проц. (пашыралі пасеўную плошчу на 2 процанта). Такім чынам у гэтыя 4 проц. пашырэньня, якія вызначаюцца на наступны год уваходзіць і даневыкананьне ў 1 проц. за мінулы год. Па павышэньню ўраджаю мы ў кантрольных лічбах запраэктавалі павысіць ураджай па індывідуальнай гаспадарцы на 20 проц., у калгасах—на 25 проц. і ў савгасах—на 30 проц. Павышэньню ўраджаю ў такім процанце павінны спрыяць уся тая сума мерапрыемстваў агрыкультурнага парадку, а таксама і сума мерапрыемстваў па пашырэньню снабжэньня сродкаў вытворчасьці сельскай гаспадаркі, якую мы вызначылі нашымі кантрольнымі лічбамі. Мы вызначаем павялічэньне пляну снабжэньня мінэральнымі ўгнаеньнямі, павялічваем плян снабжэньня сродкамі вытворчасьці, галоўным чынам сельска-гаспадарчым інвэнтаром і г. д., думаем завесьці пабольш трактараў; гэтыя вызначаныя кантрольнымі лічбамі мерапрыемствы з боку дзяржавы плюс актыўнасьць бедняцка-серадняцкіх мас сялянства—павінны забясьпечыць выкананьне павышаных намётак па ўраджаю. Не забывайце таварышы, што нам трэба выканаць па пяцігодцы ўздым ураджаю ня менш, чым на 45 проц. Па гэтаму лічбы, якія мы вызначаем, абавязковы для выкананьня.

Значную ўвагу ў нашых кантрольных лічбах мы даем справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Мы вызначылі пашырэньне плошчы пад калектывы да 30 году, прыкладна на 8 проц. усёй плошчы; гэта значыць, што ўся плошча пад калгасамі, пад сельска-гаспадарчымі вытворчымі аб'яднаньнямі і пад савгасамі да канца 30-га году павінна складаць 13 проц.

Вось калі вы падлічыце тое, што ў нас ёсьць аграмаджанага ў сельскай гаспадарцы дагэтуль, дык нам трэба будзе калектывізаваць у наступным годзе значны процант. Гэтая задача настолькі вялічэзная і адначасова настолькі адказная ў справе сацыялістычнага пераўтварэньня вёскі, што на яе выкананьне трэба паставіць разгорнутым фронтам усю партыю. Тут нам трэба максымальна завастрыць увагу ўсёй нашай партыі на перамаганьне ўсякіх перашкод, а галоўным чынам, на перамаганьне практыкі апартунізму, практыкі, якая перашкаджае і тармозіць справу калектывізацыі. Рашучая перамога над правым ухілам на практыцы, асабліва ў справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі—гэта асноўнае, што дапаможа нам з посьпехам выканаць намечаны плян калектывізацыі. Але трэба разам з разгортваньнем работы па перамозе правага апартунізму і работы па ўцягненьню бедняцка-серадняцкага сялянства ў калгасы, разгарнуць шырокую працу па арганізацыі іх вытворчасьці і снабжэньню сродкамі вытворчасьці калгасаў. Дзеля таго, каб ажыцьцёвіць праграму калектывізацыі нам прыкладна патрабуецца ня менш 1000 трактараў. Па гэтаму лінія Бюро ЦК такая, што на гэтую важнейшую справу, як снабжэньне сельскай гаспадаркі Беларусі трактарамі, мы павінны завастрыць самую сур'ёзную ўвагу нават у Маскве, каб нарэшце дабіцца інтэнсыўнага снабжэньня беларускай сельскай гаспадаркі сродкамі вытворчасьці. Аб'ектыўна зусім правільна тое, што агульнае напружанае становішча на хлебным рынку, патрабуе ад нашых кіруючых саюзных органаў максымальнай канцэнтрацыі асноўнай масы трактараў у хлебных раёнах. Гэта зусім правільна, супроць гэтага ніхто ня можа нічога сказаць, але і тое становішча, што сельская гаспадарка Беларусі ў пытаньні снабжэньня сродкамі вытворчасьці знаходзіцца ў дрэнных умовах, гэта таксама верна і зьяўляецца зусім ненармальным. Пагэтаму лінія Бюро ЦК такая, каб дабіцца пералому з боку саюзных арганізацый у сэнсе снабжэньня Беларусі трактарамі, і таму, Бюро КП(б)Б па ўсіх лініях (па савецкай і партыйнай) завастрае ўвагу ў саюзных установах на гэтым пытаньні.

Што датычыцца да мінэральных угнаеньняў, так тут у нас справа абстаіць лепш: у бягучым годзе снабжэньне мінэральнымі ўгнаеньнямі значна павялічылася. Але трэба таварышы зусім яскрава памятаць, што давядзеньне работы па аграмаджаньню гаспадаркі так, каб аграмаджаны сэктар да канца 1930 г. склаў ня менш 10 проц. усёй пасеўнай плошчы, гэтая задача настолькі вялікая і адказная, што трэба безадкладна павесьці самую актыўную працу па яе выкананьню. Інакш гэтая задача можа быць нявыканана.

Разам з гэтым я хачу спыніцца і на пытаньні зямельнай палітыкі, якая таксама зьяўляецца адным з асноўных фактараў садзейнічаньня калектывізацыі. Нельга адарваць ні на адзін мілімэтр пытаньня зямельнай палітыкі ад задач калектывізацыі. А калі мы возьмем на практыцы палітыку земляўпарадкаваньня, якая праводзілася ў БССР дагэтуль, па формах землякарыстаньня, так і па нормах землянадзяленьня, дык гэтая палітыка з боку Нарказему і ўсіх зямельных органаў праводзілася зусім няправільна. Нашымі зямельнымі органамі праводзілася кулацкая апартуністычная палітыка, якая тармазіла справу калектывізацыі і спрыяла насаджэньню кулацкіх капіталістычных гаспадарак. Тут трэба прызнацца, што і мы ўсе прагледзілі гэтае важнейшае пытаньне. Існуючая палітыка і практыка пры правядзеньні земляўпарадкаваньня патрабуе караных зьмен галоўным чынам, ва ўстанаўленьні форм і норм земляўпарадкаваньня і землянадзяленьня, бо вы ведаце, што дагэтуль у БССР хутарскія формы землякарыстаньня мелі значнае месца пры правядзеньні земляўпарадкаваньня. Па гэтаму нам трэба самым рашучым чынам з асобай сілай падкрэсьліць неабходнасьць рашучай барацьбы з хутарскімі формамі. Пленум павінен даручыць усім партыйным арганізацыям і зямельным органам прыняць самыя рашучыя захады да таго, каб не дапускаць выхаду на хутары, на атрубы і не ствараць карлікавых пасёлкаў, якія таксама зьяўляюцца ня больш ня меньш, як замаскіраваная хутарызацыя, а накіраваць нашу ўвагу ў бок шырокай калектывізацыі і вытворчага каапэраваньня. Пры такой палітыцы на калектывізацыю ня толькі хутары і атрубы, але і карлікавыя пасёлкі ня могуць мець мейсца.

Нам трэба пры індывідуальным земляўпарадкаваньні праводзіць лінію па арганізацыі буйных пасёлкаў. «Рашучая барацьба з хутарамі, з атрубамі, з карлікавымі пасёлкамі, за масавую калектывізацыю»—вось гэта павінна быць асноўным лёзунгам комуністычнай партыі Беларусі і Савецкай улады.

Я ня буду доўга спыняцца на гэтым пытаньні аб правільнай палітыцы ў пытаньнях земляўпарадкаўчай працы. Аб гэтым ужо досыць шмат і правільна пісалася, як у цэнтральным, так і ў мясцовым друку. Адзначу толькі тое, што палітыка на хутарызацыю, палітыка на насаджэньне кулацкіх гаспадарак—гэта ёсьць выраженьне на практыцы правага ўхілу, яскравае выражэньне апартунізму на практыцы з чым нам трэба весьці самую рашучую барацьбу.

Земляўпарадкаваньне падначаліць справе калектывізацыі.

Цяпер аб такім пытаньні, як нормы землянадзяленьня і землякарыстаньня. Існуючыя дагэтуль „максымальныя і мінімальныя" нормы землянадзяленьня таксама цалкам былі прыстасаваны да інтарэсаў кулацтва і ні ў якой меры ня спрыялі калектывізацыі. Наадварот, яны давалі поўную магчымасьць захоўваць значную частку заможных і нават яўна кулацкіх гаспадарак. Існуючыя нормы землянадзяленьня нам неабходна перагледзець у бок устанаўленьня адзінай нормы землянадзяленьня, бо на справе „максымальныя і мінімальныя" нормы вылучаліся двума мінімальнымі нормамі: адна (мінімальная) для беднаты, другая, так званая максымальная, зьяўлялася на справе мінімальнай для кулака. Больш таго—мінімальная норма для безьзямельных і малазямельных па сутнасьці ператваралася ў максымальную норму. Вось прыклад: калі кулак мае 20-25 дзесяцін зямлі, дык яму пры правядзеньні земляўпарадкаваньня даецца самае меншае 12-13 дзесяцін; але часам і гэтыя 20-25 дзесяцін таксама могуць яму застацца, бо аказваецца ён вышуквае больш працоўных адзінак, і ў адпаведнасьці з гэтым і павялічваецца зямельная плошча яго гаспадаркі. Па гэтаму нам трэба з асобай сілай завастрыць на пленуме ЦК КП(б)Б увагу ўсёй КП(б)Б, усёй савецкай грамадзкасьці навакол гэтага важнейшага палітычнага пытаньня, якое па сутнасьці мае рашаючае значэньне ў калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Уся земляўпарадкаўчая палітыка павінна стаць цалкам на выкананьне задачы калектывізацыі, а ў нас яна, як вы бачыце, дагэтуль ня толькі ня спрыяла калектывізацыі, а наадварот, аддаляла яе, бо ўся палітыка, якая праводзілася ў земляўпарадкаваньні даводзіла да таго, што і пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі ў нас захавалася значная частка заможных і кулацкіх гаспадарак.

Павялічыць прадукцыйнасьць працы ў прамысловасьці.

Якія канкрэтныя задачы ў нашых кантрольных лічбах мы вызначаем на 29-30 г. у разьвіцьці прамысловасьці? Тут мы вызначаем даволі высокія тэмпы. Напрыклад, павялічэньне валавой прадукцыі прамысловасьці мы запраэктавалі на 60 проц.; калі ў гэтым годзе валавая прадукцыя прамысловасьці павялічылася на 45 проц., дык у наступным годзе мы думаем павялічыць яе да 60 проц., супроць 27,4 проц., якія раней вызначаліся пяцігодкай для 29-30 г. Як бачыце, тэмп значна адрозьніваецца ад таго, які намі даваўся раней. Па рэспубліканскай прамысловасьці мы праэктуем павялічыць валавую прадукцыю на 65 проц. супроць 26,1 проц., намечаных пяцігодкай. Прадукцыйнасьць працы трэба павялічыць на 26,8 проц., намінальную зарплату мы праэктуем павялічыць на 8 проц., з тым, што рэальная зарплата павінна павялічыцца на 11 проц., дзякуючы таму, што мы праэктуем кантрольнымі лічбамі зьніжэньне індэксу бюджэтнага набору на 3 проц. Між іншым гэтая задача 3 проц. зьніжэньня бюджэтнага індэксу—гэта самая баявая задача,—бо ад выкананьня яе вырашаецца лёс на павышэньне рэальнай зарплаты на 11 проц. Прырост колькасьці рабочых кадраў, у зьвязку з запраэктаваным аб'ёмам прамысловай вытворчасьці, па нашым меркаваньням павялічыцца яшчэ на 28 проц. Зьніжэньне сабекошту праэктуецца павялічыць на 10 проц. Пытаньню зьніжэньня сабекошту прамысловай прадукцыі, уся КП(б)Б, усе гаспадарчыя органы павінны надаць выключную ўвагу, бо вы ведаеце (аб гэтым я ўжо раней гаварыў), што кожны процант недавыкананьня намечанага зьніжэньня сабекошту балюча адбіваецца на аб'ёме нашых мерапрыёмстваў па разьвіцьці прамысловасьці БССР. У гэтым годзе, як вы ўжо чулі, мы недавыканалі плянавага заданьня па зьніжэньні сабекошту. Такое становішча ня можа мець месца ў наступным годзе. Тут трэба мабілізаваць усю суму мерапрыёмстваў, якія датычацца да гэтай справы, каб выканаць задачу па зьніжэньні сабекошту ня менш, як на 10 проц.

Капітальныя ўкладаньні і энэргэтыка

Капітальныя ўкладаньні ў народную гаспадарку, якія зьяўляюцца галоўнейшым фактарам забесьпячэньня тэмпу росту, як сельскай гаспадаркі, так і прамысловасьці, мы вызначаем у наступных разьмерах: разьмеры капітальных укладаньняў у сельскую гаспадарку праэктуюцца ў 60,7 мільёнаў рублёў супроць 30 мільёнаў бягучага году, гэта значыць рост больш чым на 100 проц., прычым укладаньні ў сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі мы вызначаем у аб'ёме 44,8 проц. Як бачыце, асноўная сума сродкаў, якія накіроўваюцца ў сельскую гаспадарку, ідуць на сацыялістычны сэктар. Магчыма, што кіраўнікі Наркамзему тут выступяць і будуць паказваць, што гэтая сума ў 60,7 мільёнаў рублёў невыстарчальна для забясьпечаньня вызначаных задач у разьвіцьці сельскай гаспадаркі, асабліва ў частцы яе калектывізацыі. Па свойму яны будуць правы; супроць гэтага супярэчыць канешна цяжка, але справа абстаіць так, што мы ў нашых грашовых плянах, і ў бюджэце, і ў крэдытных плянах зьвялі да мінімуму фінансаваньне індывідуальнага сэктару сельскай гаспадаркі, пакінуўшы толькі забесьпячэньне разьвіцьця чыстагатункованага насеньня (без чаго ніяк нельга абыйсьціся) забесьпячаньне мінэральнымі ўгнаеньнямі, кантрактацыяй і г. д. Так што агульны аб'ём укладаньняў у сельскую гаспадарку за адзін год павялічыць яшчэ больш будзе цяжка, а зусім скараціць фінансаваньне індывідуальнага сэктару па такіх галінах, як угнаеньне, разьвіцьцё гатункованага насеньня і г. д. мы ня можам, і застаўляем на гэтыя справы прыблізна 9 мільёнаў, а ўся астатняя сума ідзе на сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі і на навукова-даследчую працу, без якой таксама нельга абыйсьціся.

На рэспубліканскай прамысловасьці аб'ём капітальных укладаньняў кантрольнымі лічбамі вызначаецца ў суме 52 мільёна рублёў. Гэта таксама павялічвае разьмеры прамысловага будаўніцтва ў параўнаньні з мінулым годам прыкладна на 95 проц. Так што, як бачыце, капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць амаль што падвойваюцца.

Важнейшую ролю адыгрывае зараз на Беларусі пытаньне арганізацыі энэргетычнай гаспадаркі. Мы ўжо між іншым і зараз сустракаем такі факт, што наша прамысловасьць у сваім разьвіцьці будзе мець тормаз, калі нам ня ўдасца ў адпаведным аб'ёме пашырыць энэргетычную базу разам з разьвіцьцём прамысловага будаўніцтва. Сёньня ўжо як бачыце, наша прамысловасьць расьце вельмі шпарка і шчыльна ўпіраецца ў адсутнасьць энэргетычнай базы. І па гэтаму пытаньню электрабудаўніцтва, як асноўнай часткі энэргетыкі БССР, перад намі стаіць ва ўвесь рост, і пагэтаму на справу электрабудаўніцтва мы павялічваем аб'ём капітальных укладаньняў прыкладна ў 2 з пал. разы; у сумах гэта азначае, што па электрабудаўніцтва мы праэктуем укласьці 24,4 мільёны рублёў супроць 9,6 міл. руб. у мінулым годзе. Так, што перад намі зараз аднэй з асноўных праблем тэхнічнай рэканструкцыі зьяўляецца праблема электрабудаўніцтва, прычым мы ў гэтым годзе вызначаем у нашых кантрольных лічбах абавязковае сканчэньне першай чаргі Асінаўскай раённай электра станцыі імя Сталіна да жніўня 1930 году, з тым, каб пачаць і будаўніцтва другой чаргі.

Адначасова мы намячаем пачатак пабудовы другой раённай электрастанцыі ў 1929-30 г. на Гомельшчыне.

Будаўніцтва Асінбуду мы можам выканаць своечасова ў вызначаны тэрмін. Тут у нас затрымкі няма. Якраз учора мне прышлося чуць на пасяджэньні СНК БССР даклад РСІ, якая абсьледвала ход будаўніцтва Асінбуду, і па яе дакладу на пасяджэньні СНК было адзначана, што з боку будаўніцтва, гэта значыць з боку будуючых арганізацый, зроблена ўсё, каб гэта будаўніцтва прайшло без затрымак, і без вялікіх прарэх. Так што ход самага будаўніцтва ідзе нармальна, але абсталяваньне ў вызначаны час ня будзе дадзена. Напрыклад, Ленінградзкі машынабудаўнічы завод пратэрміноўвае выкананьне заказу, прыкладна да 9 месяцаў; па замежнаму заказу таксама маецца некаторая затрымка і ён у тэрмін ня будзе выканан. У зьвязку з гэтым, хочам мы гэтага ці ня хочам, а нам прыдзецца адтэрмінаваць пуск першай чаргі Асінбуду. Між іншым мы ўчора вынесьлі адпаведную пастанову, каб аб гэтых затрымках давесьці да ведама Савету Працы і Абароны, паказаўшы, што наша гаспадарка на гэтым шмат траціць. Мне здаецца, што нам удасца паставіць адпаведную інфармацыю пра ход будаўніцтва на Асінбудзе ў Савеце Працы і Абароны і з дапамогай саюзных органаў прымусіць падагнаць належныя машынабудаўнічыя арганізацыі з выкананьнем нашых заказаў.

Пытаньне падрыхтоўкі спажыўцоў таксама часткова ўпіраецца ў выкананьне іх заказаў на абсталяваньне. Трэба адзначыць, што ня гледзячы на тое, што пытаньню падрыхтоўкі спажыўцоў Асінбуду ўсе нашы арганізацыі надалі належную ўвагу, нам на вялікі жаль ня ўдасца поўнасьцю да пачатку пуску падрыхтаваць належную загрузку.

Падрыхтоўка спажыўцоў—гэта сур'ёзнейшая справа. Мы тут павінны ўсё паставіць на работу—і Акрвыканкомы і прамысловасьць. Дырэктары фабрык і ВСНГ цалкам павінны больш рыхтавацца да прыняцьця і спажываньня энэргіі Асінбуду, бо інакш мы можам апынуцца ў такім становішчы, у якім апынулася „ЗАГЕС", якую пусьцілі ў ход, а яна некаторы час круцілася ў халастую.

Тут ёсьць яшчэ адна акалічнасьць. Справа ў тым, што ГЕТ настайвае на пабудове ў Магілеве асобнай электрастанцыі для фабрыкі штучнага валакна і справае даказаць, што кошт электраэнэргіі ад гэтай станцыі будзе таней, чым энэргія з Асінбуду. Ён кажа, што з уласнай станцыі фабрыкі штучнага шоўку кошт электраэнэргіі ад гэтай станцыі будзе таней, чым энэргія з Асінбуду. Ён кажа, што з уласнай станцыі фабрыкі штучнага шоўку кошт электраэнэргіі будзе складаць 2,8 кап., а кошт Асінабудаўскай энэргіі будзе складаць 6,4 кап. Мы зразумела ня можам адразу гэта абвергнуць, як і ня можам паверыць гэтаму, але мы цьвёрда ўстанавілі, што незалежна ад усякіх праэктаў і меркаваньняў з боку каго-б та ні было, магілеўцаў ці гэтаўцаў, але пытаньне падрыхтоўкі Магілева да спажываньня энэргіі Асінбуду павінна ісьці поўным ходам, бо майце на ўвазе, што Магілёў зьяўляецца такім спажыўцом, які будзе спажываць прыкладна 30 проц. энэргіі Асінбуду. Пагэтаму мы даручылі нашаму Дзяржпляну на працягу тыдню вывучыць пытаньне, якое высоўваецца ГЭТ'ам і ў тыднёвы тэрмін даць заключэньне ў СНК для канчатковага вырашэньня.

Пэрспэктывы бюджэту.

Зараз я спынюся на пэрспэктывах бюджэту. Рост дзяржаўнага бюджэту на 1929-30 г. мы вызначаем у 51,6 проц. пры росьце яго ў бягучым годзе, як я аб гэтым ужо гаварыў, процантаў на 45-50. У абсалютным аб'ёме наш бюджэт павінен вырасьці з 95 млн. да 144,8 млн. р. амаль што да 145 млн. р. са значным дэфіцытам, які будзе складаць каля 28 проц. усяго аб'ёму бюджэту.

Вось гэтая частка кантрольных лічбаў (бюджэт) патрабуе максымальнай ўвагі ад Пленуму ЦК КП(б)Б, бо пры ўмовах, калі мы ў гэтым годзе атрымліваем датацыю ў Саюзе, прыкладна, 15-16 млн. руб., атрымаць каля 40 млн. руб. датацыі ў 1929-30 годзе ня так лёгка, а без такога аб'ёму бюджэту мы ня зможам забясьпечыць і разьмеры капітальнага будаўніцтва і ўзмацніць сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі, мы ня зможам абслужыць сацыяльна-культурныя запатрабаваньні па ўвядзеньню ўсеагульнага навучаньня і г. д., і г. д.

Мы ідзем з дэфіцытам у Саюз ССР у разьмеры 28 проц. ад усяго бюджэту, прычым у гэтым дэфіцыце значная частка вылучана ў якасьці субвэнцыі мясцоваму бюджэту (на ўсеагульнае навучаньне, на будаўніцтва дарог і г. д.). Гэта сур'ёзнейшая справа, якой трэба надаць максымум увагі.

Рост мясцовага бюджэту кантрольнымі лічбамі праэктуецца, прыкладна, на 36,2 проц. Я ня буду падрабязна аналізаваць гэтыя бюджэтныя лічбы, бо гэта патрабуе шмат часу, але такі аб'ём бюджэту, як мясцовага, так і дзяржаўнага мы яшчэ ні ў адзін год ня вызначалі. Гэта я падкрэсьліваю, бо гэта вялізарнейшы рост.

Таму ня толькі трэба думаць аб пакрыцьці дэфіцыту Саюзам ССР, але нам трэба будзе як след у першую чаргу націснуць і на адшуканьне мясцовых крыніц прыбытку для мясцовага бюджэту і націснуць на павялічэньне прыбытку для дзяржаўнага бюджэту.

Перад тым, як кончыць асьвятленьне задач гаспадарчага будаўніцтва, я яшчэ спынюся на такім пытаньні як загатоўкі.

Хлебазагатоўкі мы ў гэтым годзе кантрольнымі лічбамі павышаем з 4 да 7 млн. пуд., як бачыце, амаль што ў два разы. Нашы эканамічныя органы гарантуюць нам рэальнасьць гэтага пляну і што на падставе ўзроўню ўраджаю, які ў нас ёсьць гэтая лічба зусім рэальна для выкананьня.

Але выканаць гэтыя загатоўкі, па мойму, ня так лёгка будзе, і вам трэба будзе як і ў мінулым годзе на пытаньнях хлебазагатовак і загатовак ільну сканцэнтраваць максымум увагі. Падрыхтаваць апарат для загатовак—гэта самая асноўная задача, бо неабходнасьць чоткасьці яго работы—гэта пытаньне бясспрэчнае. Зьнішчэньне канкурэнцыі, ажыватажу абавязкова для ўсіх загатоўцаў. На загатоўках будучага году як і раней, нам прыдзецца канцэнтраваць увагу бядняцка-серадняцкіх мас сялянства з такім разьлікам, каб мы змаглі вопыт мінулага году ў загатоўчых раёнах СССР скарыстаць і ў нас гэта азначае, што мы павінны давесьці загатоўчыя пляны да вёскі да самага нізу і каб вакол гэтых загатоўчых плянаў была-б мабілізавана беднота. Мабілізаваць грамадзкае ўзьдзейнічаньне на хлебатрымацеля—гэта задача, памойму, у нас ва ўмовах БССР новая, мы яшчэ практыкі яе ўжываньня ня маем, але між іншым гэта досыць рэальны сродак мабілізацыі грамадзкасьці вясковай беднаты і сялянскіх мас вакол важнейшага пытаньня загатовак, які разам з эканамічнаю ролью адыгрывае і асноўную палітычную ролю ў выкананьні загатовак і ва ўзмацненьні саюзу пралетарыяту з бядняцка-серадняцкім сялянствам на фронце барацьбы з кулаком, нэпманам і спэкулянтам.

Так што гэтыя мэтады работы мы прадугледжваем у праэкце нашай рэзалюцыі, фармулюючы гэты пункт так, што трэба даводзіць загатоўчыя пляны ўключна да вёскі і вакол гэтых плянаў мабілізаваць бядняцка-серадняцкую грамадзкасьць.

Разам з гэтым, я яшчэ раз падкрэсьліваю, трэба будзе надаць асаблівую ўвагу загатоўкам экспартных прадуктаў. У гэтым годзе намі павялічваецца экспартны плян, мы яго, зразумела, павінны выканаць поўнасьцю, а калі толькі выконваць экспартны плян за лік лесу, калі мы ня зможам падняць масу другарадных прадуктаў сельскай гаспадаркі і прадуктаў прамысловасьці, дык гэта будзе грубай памылкай тым больш, што мы маем магчымасьць, акрамя лесу загатовіць масу дробных прадуктаў на выкананьне экспартнага пляну. У кожным выпадку тыя нашы «чырвоныя гандляры» з каапэрацыі на павозках з абвязанай чырвоным палатном дугой, якія мелі месца ў мінулым годзе, павінны мець большае ўжываньне, чым у бягучым годзе, бо прыклад ёсьць, а ў гэтым годзе ён ня быў скарыстаны як сьлед.

Вялікую ўвагу ў кантрольных лічбах мы надаем арганізацыі рынку с-г прадуктаў. бо гэта ў нас яшчэ слабое месца, якое адбіваецца на бюджэце рабочых, які (рынак с-г прадуктаў) мае сур'ёзнейшае дачыненьне і да ўзмацненьня ўзаемаадносін прамысловасьці з сельскай гаспадаркай. Пагэтаму пытаньню арганізацыі рынку с-г прадуктаў трэба будзе ў гэтым годзе надаць значна больш увагі, чым гэта было ў мінулым годзе.

Нам трэба лепш арганізаваць малочны, садова-гародні і мясны рынкі, таму і ў кантрольных лічбах вы знойдзеце такое месца, дзе прапануецца Наркамзему і с.-г. каапэрацыі арганізаваць спэцыяльныя дзяржаўныя садова-гароднія савгасы вакол буйных гарадоў, бо пытаньне садова-гароднага рынку ў нас вельмі дрэнна пастаўлена.

Мы таксама прадугледжваем у кантрольных лічбах арганізацыю малочных савгасаў, бо ў нас справа з малочнымі прадуктамі, з маслам, абстаіць вельмі дрэнна. Мала таго, што мы дрэнна арганізуем малочна-сялянскі рынак, мы ня маем ніякай апорнай дзяржаўнай базы па загатоўцы малака і масла. Таму задача арганізацыі дзяржаўных савгасаў, як малочных, так і гародніх набывае актуальнейшае значэньне, якое павінна ўзмацняць бюджэт рабочых і палепшыць забясьпечаньне шырокіх працоўных мас гэтымі прадуктамі.

Палепшым культурна-бытавое абслугоўваньне патрэб рабочае клясы.

Разам з мерапрыёмствамі па палепшаньні гаспадарчага і эканамічнага разьвіцьця БССР, кантрольнымі лічбамі прадугледжваецца і задача палепшаньня культурна-бытавога абслугоўваньня патрэб рабочае клясы, бо культурныя запатрабаваньні рабочых мас разам з ростам палепшаньня матар'яльнага становішча таксама растуць.

Такім чынам, нам трэба зрабіць усё неабходнае для таго, каб палепшыць абслугоўваньне культурна бытавых запатрабаваньняў працоўных мас і ў зьвязку з гэтым мы ставім у кантрольных лічбах рэальную задачу ўзмацненьня і пашырэньня сеткі культурна-бытавых устаноў. Тут ідзе пытаньне аб клюбах, бібліятэках, хатах-чытальнях, дзіцячых установах і цэлага шэрагу іншых мерапрыёмстваў, якія павінны задаволіць культурныя запатрабаваньні рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства. У гэтым годзе мы значна пашыраем мерапрыёмствы зьвязаныя з ажыцьцяўленьнем культурнай рэвалюцыі. Асыгнаваньні па лініі народнай асьветы па праэкту кантрольных лічбаў растуць у значным разьмеры. У гэтай галіне працы асаблівае значэньне маюць такія пытаньні як ажыцьцяўленьне пляну ўсеагульнага навучаньня, ліквідацыя няпісьменнасьці і падрыхтоўка тэхнічных кадраў. Аб кадрах мне прыдзецца спэцыяльна спыніцца ў далейшай частцы майго дакладу.

Праверым падрыхтаванасьць да абароны краіны.

Мне хацелася яшчэ спыніцца на такім пытаньні, як абарона. Калі вы будзеце складаць акруговыя кантрольныя лічбы, дык трэба і ў кантрольных лічбах акруговых арганізацый, як гэта зроблена і ў іншых, максымальную ўвагу надаць пытаньню абароны СССР.

Я ня буду гаварыць многа аб значэньні гэтага пытаньня, яно ясна для ўсіх, бо досыць напомніць аб канфлікце на Кітайска-Усходняй чыгунцы, досыць напомніць аб гандлі паміж капіталістычнымі дзяржавамі, які толькі што адбываўся ў Гаазе, досыць напомніць пра яскравае абвастраньне клясавай барацьбы ў капіталістычных дзяржавах, якое зараз мы наглядаем і на тыя супярэчнасьці, якія растуць паміж паасобнымі капіталістычнымі дзяржавамі, каб ведаць аб тым, што пытаньне падрыхтоўкі вайны супроць СССР з боку імпэрыялістычных дзяржаў—гэта пытаньне не тэарэтычнага зьместу, а рэальнае пытаньне, і таму падрыхтоўка краіны да абароны ў сучасны момант, як ніколі, стаіць рэальна і нам прыдзецца на падрыхтоўку ўсёй нашай народнай гаспадаркі, у тым ліку і мясцовай, да абароны зьвярнуць сур'ёзную ўвагу.

У гэтай частцы работы—падрыхтоўкі да абароны ў нас адыгрываюць вялікую ролю вайсковыя манэўры, якія будуць праводзіцца ў хуткім часе на тэрыторыі БССР. Гэтыя вайсковыя манэўры між іншым маюць буйнае для ўсёй БССР, для ўсёй КП(б)Б значэньне бо мала таго, што на манэўрах будзе правярацца баяздольнасьць Чырвонай арміі, на гэтых манэўрах па сутнасьці мы будзем правяраць як уся БССР, і першую чаргу партыя, рабочая клясе і працоўнае сялянства—як яны гатовы да абароны СССР.

Зараз на даным адрэзку часу г. зн. у верасьні месяцы, памойму, для ўсёй КП(б)Б асноўнай задачай в ўсёй рабоце зьяўляецца задача праверкі нашай падрыхтаванасьці да абароны СССР, скарыстоўваючы для гэтага вайсковыя манэўры. Акрамя таго, манэўры будуць праверкай і нашай палітычнай работы сярод шырокіх рабочых мас і сялянства.

Па-другое, нам трэба праверыць як мы ў нашых гаспадарчых плянах улічваем запатрабаваньні ўзмацненьня Чырвонай арміі і падрыхтоўкі ўсёй нашай гаспадаркі да ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны.

Такім чынам манэўрам, разам з прадугледжанымі ў нашых кантрольных лічбах пытаньнем абароны трэба надаць вялікую ўвагу. Мне думаецца гэта будзе праверкай работы КП(б)Б па яе падрыхтаванасьці да абароны і як яна, КП(б)Б, арыентуе і падрыхтоўвае масы ў гэтай важнейшай справе.

Для выкананьня 5-годкі трэба ўцягнуць новыя кадры рабочых на кіруючыя работы.

У зьвязку з тымі вялізарнымі задачамі, якія вызначаюцца нашым гаспадарчым плянам, работа ўсіх плянавых арганізацый набывае вялізарнае значэньне, узмацненьне работы плянавых арганізацый ня можа выйсьці з парадку дню кожнага партыйнага камітэту. Трэба каб і па вэртыкале і па гарызанталі мы зьвярнулі максымум увагі рабоце плянавых органаў, трэба паслаць туды больш камуністаў-эканамістаў. Гэта задача сёньняшняга дня.

Вы ведаеце, якое значэньне мае плянавая работа і ведаеце, што ў нашых розных установах на плянавай рабоце часта яшчэ сядзяць у якасьці спэцыялістаў і ня нашы людзі, што туды зацёсваюцца элементы, якія стаяць на пазіцыі дробна-буржуазнай ідэалёгіі і ўсе нашы пляны ў гэткіх выпадках, якія выпрацоўваюцца гэткімі людзьмі, могуць атрымаць зусім уродлівую форму з дробна-буржуазнымі апартуністычнымі ўстаноўкамі. Мы ня можам без адпаведнага насышчэньня эканамічных і плянавых органаў вытрымаными камуністамі і добрасумленнымі спэцыялістамі найбольш поўна мабілізаваць усе тыя рэсурсы, якія закладзены ў нашай краіне, мы ня зможам узьняць іх, ня зможам паставіць на службу індустрыялізацыі, бо плянавыя органы адыгрываюць важнейшую ролю ў падрыхтоўцы для партыі і савецкай улады плянаў сацыялістычнага будаўніцтва, праз савецкія, праз плянавыя органы партыя дэтальна вывучае ўсе эканамічныя працэсы, якія адбываюцца ў нашай краіне, на падставе чаго і вызначаецца адпаведны плян сацыялістычнага будаўніцтва. І толькі праз камуністаў, працуючых у плянавых, гаспадарчых і савецкіх органах гэта можна праводзіць больш пасьпяхова. І таму пасадзіць на работу ў плянавыя органы зараз-жа лепшых камуністаў—гэта задача, памойму, кожнага акругкому, а таксама і задача ЦК КП(б)Б.

Устаноўка на ўзмацненьне работнікамі плянавых акруговых камісій датычыцца і статыстычных устаноў, бо вы ведаеце, што на падставе работы статыстычных устаноў мы плянуем разьвіцьцё ўсёй нашай народнай гаспадаркі і кожная прарэха ў рабоце статыстычных устаноў, гэта значыць па сутнасьці прарэха ва ўсіх нашых плянах.

Таму работы статыстыкі ва ўмовах сацыялістычнага плянаваньня народнай гаспадаркі, ва ўмовах плянаваньня ўсяго будаўніцтва набывае першачарговае значэньне, замацаваньне работнікамі гэтых абодвых эканамічных плянавых органаў—статбюро і плянавых камісій—на сутнасьці прадрашае пасьпяховасьць вызначэньня і выкананьня нашых плянаў і ўстанаўленьне правільнай лініі ў разьвіцьці народнае гаспадаркі.

Калі я гаварыў аб узмацненьні работы плянавых ячэек у „гарызанталь" ным" напрамку, то гэта азначае, што гэткая ўстаноўка датычыцца Наркамзему, ВСНГ, Наркамфіну, а ў акругох зямельнага кіраўніцтва, аддзелаў мясцовай гаспадаркі, прамысловасьці і г д.

Яшчэ раз падкрэсьліваю неабнасьць паслаць туды добрых камуністаў, каб ня нашы спэцы, якія яшчэ ёсьць у нашых установах не падводзілі нашых кіраўнікоў-камуністаў, з якіх многія прывыклі толькі штампаваць пляны, а не кіраваць па-сутнасьці ўсёй дзейнасьцю адпаведных савецкіх і плянавых устаноў. А камуністам, працуючым у розных савецкіх, гаспадарчых і плянавых органах трэба самым рашучым чынам узмацніць кіраўніцтва, трэба спыніць штампоўку, трэба сапраўды кіраваць, а не фармальна штампаваць і вось асноўная задача, якую ўсе камуністы-гаспадарнікі, эканамісты і плянавікі павінны ажыцьцяўляць. А гэта ў сваю чаргу патрабуе ад партыйных камітэтаў вылучыць лепшых падрыхтаваных членаў партыі на гаспадарчую работу.

Усе гэтыя задачы па выкананьні плянаў сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць чоткай работы ўсяго партыйнага, савецкага і гаспадарчага апарату. Нам трэба сапраўды прыстасаваць савецкі і гаспадарчы апарат да выкананьня гэтых складанейшых задач—ажыцьцяўленьня сацыялістычнай рэканструкцыі, усей народнай гаспадаркі. Таму я хачу спыніцца на пытаньнях чысткі савецкага апарату. У мяне склалася гэткае ўражаньне, што ў нас недаацэньваюць гэту важнейшую работу.

Падкрэсьліваю, што калі мы складалі пяцігодку, калі мы яе дакладвалі на зьезьдзе партыі і на зьездах саветаў, мы тады гаварылі, што пяцігадовы плян разьвіцьця народнае

задача ўзмацненьня кіруючых кадраў партыі. На даным этапе гэта зьяўляецца асновай усіх асноў, бо, ведаеце, што чыстка кіруючых кадраў КП(б)Б нам паказала, што частка гэтых кадраў не адпавядае свайму прызначэньню, што гэта частка ня можа ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, ва ўмовах рашучага сацыялістычнага наступленьня на капіталістычныя элементы, праводзіць яскравую лінію партыі.

З боку шэрагу кіраўнікоў наглядаецца недапушчальная блытаніна, як у пытаньнях эканамічнай палітыкі, гэтак і ў пытаньнях нацыянальнай палітыкі, таму замяшчэньне новымі растучымі кадрамі з пралетарскага асяродзьдзя тых працаўнікоў, якія аказваюцца няздольнымі праводзіць лінію партыі—гэта такая задача, якая павінна стаяць перад усімі партыйнымі арганізацыямі. Аб кіруючых кадрах КП(б)Б у нас на пленуме стаіць спэцыяльны даклад, таму я ня буду многа спыняцца на гэтым, але яшчэ раз паўтараю, што гэта пытаньне зьяўляецца асноўным з асноўных у нашай працы. Таму задача вылучэньня сьвежых сіл, новых работнікаў на кіруючыя пасады абнаўленьня кадраў, зьяўляецца баявой задачай. А што-ж у нас палучаецца на справе? Аказваецца, што мы толькі гаворым, а колькі мы вылучылі за гэты пэрыяд рабочых як у партыйны, гэтак і ў савецкі апарат? Зусім мала. Тут у нас пахваліцца няма чым.

Такім чынам пытаньне больш рашучага і сьмелага вылучэньня ў першую чаргу рабочых — гэта ёсьць самая сур'ёзнейшая справа.

Праўда, калі ўзяць арабочаньне дзяржаўнага апарату, то мы ўжо некаторыя крокі прынялі. Напрыклад, пры ЦК мы ў бліжэйшы час арганізуем спэцыяльныя курсы па падрыхтоўцы вылучэнцаў, але на гэтым ніяк нельга спыніцца. Гэта ня ўсё. Гэта па сутнасьці кропля, як кажуць у моры вады, у параўнаньні з тым, што нам трэба зрабіць.

Трэба, каб гэта работа праводзілася кожнай ячэйкай, кожным райкомам, кожным акругкомам і разам з раскачваньнем самакрытыкі мас навакол выкананьня нашых гаспадарчых плянаў, трэба адначасова раскачваць шырокія рабочыя масы і навакол чысткі савецкага апарату і на вылучэньне рабочых на кіруючыя пасады.

Арабочаньне савецкага апарату,—гэта адзін з асноўных лёзунгаў сучаснасьці.

На барацьбу з правымі ўхіламі і прымірэнцтвам трэба завастрыць увагу ўсяе арганізацыі.

Апошняе, на чым я хачу з асобай сілаю завастрыць увагу пленуму—гэта барацьба з правым апартуністычным ухілам.

З тых фактаў, якія падазены ў кантрольных лічбах і ў маім дакладзе, вы бачыце, што ня гледзячы на тое, што правая пазіцыя тармазіла работу па выкананьні пяцігодкі, мы, ня гледзячы на гэта маем вялізарнейшыя посьпехі. Мы першы год пяцігодкі выканалі звыш пляну. Гэта і дала магчымасьць Бюро ЦК КПБ даць дырэктыву адпаведным савецкім і плянавым органам аб неабходнасьці перагляду пяцігодкі ў бок пашырэньня аб'ёму мерапрыемстваў па асноўных галінах народнай гаспадаркі. Мы, бязумоўна, маем магчымасьць унесьці шэраг карэктыў у нашу пяцігодку ў бок павялічэньня тэмпаў будаўніцтва.

І пасьля ўсяго гэтага хіба не ясна, што „тэорыя" правых апракінута самім жыцьцём, што лепшай праверкай правільнасьці рашучага курсу партыі на шпаркі тэмп індустрыялізацыі і на сацыялістычнае ператварэньне сельскай гаспадаркі па шляху калектывізацыі зьяўляецца пасьпяховае выкананьне гаспадарчай праграмы 1928-29 г.

Хіба не ясна, што на павікёрскае сьцьвярджэньне правых апартуністаў аб „дэградацыі" сельскай гаспадаркі і аб немагчымасьці выкананьня намечанага партыяй тэмпу індустрыялізацыі, пралетарыят і пад яго кіраўніцтвам бядняцка серадняцкае сялянства адказалі магутным вытворчым энтузіязмам, магутнай хваляй сацыялістычнага будаўніцтва і разгортваньня шырокага калектыўнага руху.

Хіба не ясна з таго, што наперакор апартуністычным тэорыям аб неабходнасьці стрымліваньня тэмпу індустрыялізацыі і аб разьвязваньні ініцыятывы кулацкіх элемэнтаў у вёсцы, працоўныя масы Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам кампартыі на падставе яе генэральнай лініі шпаркімі крокамі прасоўваюцца ўперад па шляху індустрыялізацыі краіны і па шляху энэргічнага сацыялістычнага наступу, рашуча перамагаючы ўзросшае супраціўленьне кулацка-нэпманскіх элемэнтаў. І гэтым самым падкрэсьліваюць шырокія пралетарскія масы аб яўнай няпрыймальнасьці ідэй правых апартуністаў. Хіба гэтым рабочыя масы не разьбілі дашчэнту ідэі правай апазіцыі?

Намойму, гэтых фактараў дастаткова для таго, каб і ўсім хістаючымся элемэнтам пераканацца ў бясспрэчна правільнай лініі нашай партыі і ў ідэйнай блытаніне людзей з лягеру правай апазіцыі.

А ўсё-ж такі, ня гледзячы на тое, што факты, якія сьведчаць аб пасьпяховым будаўніцтве, што само жыцьцё на ўсе сто процантаў апраўдывае генэральную лінію нашай партыі і далкам бяз рэшткаў апракідвае на голаву розныя тэорыі правых апартуністаў бухарынскага толку,—усё-такі, ня гледзячы на гэта, правая апазіцыя ня спыняе сваёй апартуністычнай дзейнасьці па сьцьвярджэньні неабходнасьці ўтрыманьня тэмпу сацыялістычнага будаўніцтва і яны ўсё-ж не адмаўляюцца ад сваіх памылак і далей настайваюць на іх.

Усё гэта вымагае далейшай самай бязьлітаснай барацьбы з правым апартуністычным ухілам і з прымірэнчымі да яго адносінамі.

Таму пленуму ЦК КП(б)Б на гэтай барацьбе яшчэ раз неабходна завастрыць увагу ўсёй арганізацыі.

Я лічу, што нашаму пленуму ЦК неабходна з самай рашучасьцю паставіць пытаньне перад бухарынскай апазіцыяй аб тым, каб яна неадкладна адмовілася ад сваіх памылак і суцэленна праводзіла генэральную лінію партыі, адмовіўшыся ад сваёй панікёрскай дэзарганізатарскай дзейнасьці.

Гэта, правая апазіцыя, павінна зрабіць безадкладна. Наш пленум ЦК павінен зьвярнуцца да ЦК УсеКП з настойлівым запатрабаваньнем аб тым, што калі правая апартуністычная апазіцыя ня прызнае сваіх памылак, дык да яе неабходна неадкладна ўжыць адпаведны пункт пастановы пленуму ЦК УсеКП, які адбыўся ў красавіку.

Мы павінны дабіцца таго, каб правая бухарынская апазіцыя сваёю панікёрскаю дзейнасьцю не перашкаджала партыі мабілізаваць шырокія рабочыя масы на справу сацыялістычнага будаўніцтва, на рашучую перамогу і выкарчоўваньне элемэнтаў капіталізму ў нашай краіне.

Мы павінны ад імя пленуму ўпэўніць наш кіруючы штаб Ленінскага ЦК УсеКП у тым, што КП(б)Б заўсёды і надалей будзе заставацца лепшым атрадам УсеКП у барацьбе з правым апартунізмам, у барацьбе за ленінскую генэральную лінію партыі.

Вось на гэтым і дазвольце скончыць мой даклад.

(*Канец*).

Усю працу культурна-асьветных установаў— на службу сацыялістычнаму будаўніцтву.

СУЧАСНЫЯ ЗАДАЧЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА ПАТРАБУЮЦЬ ПЕРАБУДОВЫ ФОРМ І МЭТАДАЎ ПРАЦЫ, ШЫРОКАГА РАЗГОРТВАНЬНЯ САМАКРЫТЫКІ.

За выразную клясавую лінію ў культасьветнай працы, за рашучую барацьбу з усялякім скажэньнем пралетарскай ідэолёгіі.

ПРАЦУ КУЛЬТАСЬВЕТНЫХ УСТАНОЎ—НА РЭЙКІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА

ДА УСІХ АСЬВЕТНІКАЎ і КУЛЬТАСЬВЕТНЫХ УСТАНОЎ БССР.

Для больш хуткага ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва і ўзмацненьня абароназдольнасьці Савецкага Саюзу, у адказ на правакацыю кітайскіх наймітаў імпэрыялізму, савецкі ўрад выпусьціў III пазыку індустрыялізацыі.

Рабочыя масы і ўсе працоўныя СССР, добра ўяўляючы вялікае значэньне для сацыялістычнага будаўніцтва своечасовай і поўнай падпіскі на III пазыку індустрыялізацыі, яшчэ загадзя сталі падпісвацца на гэту пазыку.

Асабліва шпарка пашыраецца падпіска сярод рабочых і служачых горада і мястэчка, прычым шмат у якіх выпадках яна ахапіла ўжо больш як 100 проц. іх месячнага заробку.

Але слаба яшчэ ідзе падпіска на III пазыку сярод працоўнага сялянства.

Гэта тлумачыцца слабай пастаноўкай растлумачальнай працы на вёсцы.

Прымаючы над увагу вялікую палітычную значнасьць своечасовай рэалізацыі III пазыкі індустрыялізацыі, Наркамасьветы і цэнтральнае праўленьне саюзу працасьветы яшчэ раз зварачаецца да ўсіх асьветнікаў і культасьветных установаў шырока разгарнуць масавую агітацыйную працу за пашырэньне падпіскі на III пазыку.

У вытворчыя пляны школ і культасьветных установаў павінна быць уключана прапаганда III пазыкі, як адзін з галоўнейшых відаў грамадзка-карыснай працы. Правядзеньне школай „Дню ўраджаю і калектывізацыі" павінна быць увязана з прапагандай пашырэньня падпіскі на III пазыку індустрыялізацыі. З самага пачатку школьных заняткаў неабходна правесьці падпіску на аблігацыю пазыкі школьнікамі, разгарнуць падпіску шляхам прапаганды пазыкі на бацькаўскіх сходах і сходах вёскі, шляхам абходу хат зьвеньнямі вучняў і растлумачэньня ў насьценнай газэце.

Прапаганда і распаўсюджаньне пазыкі павінна стаць сродкам сацыялістычнага спаборніцтва.

Арганізуйце паміж школамі, хатамі-чытальнямі, клюбамі, бібліятэкамі, паміж райённымі калектывамі асьветнікаў сацыялістычнае спаборніцтва па пашырэньню падпіскі на III пазыку індустрыялізацыі.

Арганізуйце вызавы, узаімаправерку, перапіску па пытаньням папулярызацыі і распаўсюджаньня пазыкі.

Зварушыце шырокую самадзейнасьць вучняў, бацькоў, актыва клюбаў і хат-чытальняў.

Ніводнага рабочага, ніводнага служачага, які-б не падпісаўся на месячны заробак.

Ніводнага сялянскага двара, ніводнай хаты бяз аблігацыі III пазыкі.

Вось абавязак, які патрэбна выканаць.

Нам. Нар. Кам. Асьветы **Слонім.**
За Старшыню ЦК Прафсаюзу
Працасьветы **Шварц.**

„Савецкую Беларусь" у асьветніцкія масы.

Асьветнікі пашыраюць „Савецкую Беларусь".

(Боркавіцкі райён, Полацкай акругі).

На канфэрэнцыі асьветнікаў Боркавіцкага райёну, якая адбывалася 6—7 верасьня г. г., пры разглядзе пунктаў сацыялістычнага спаборніцтва, канфэрэнцыяй унесены наступны пункт:

Мы, асьветнікі Боркавіцкага райёну, у ліку 90 асоб, падпісваемся на газэту „Савецкая Беларусь" тэрмінам на адзін год (з 1 кастрычніка г. г. па 1 кастрычніка 1930 г.) і выклікаем Дрысенокіх асьветнікаў пасьледваць нашаму прыкладу.

У гэты-ж самы дзень падпіска была поўнасьцю афармлена, сума якой складае 720 руб.

Ніводнага асьветніка без „Савецкай Беларусі".

(Полацкі райён, Полаччына).

8—9 адбылася райённая канфэрэнцыя асьветнікаў, на якой паміж іншымі пытаньнямі займала належнае месца пытаньне аб уступленьні ў сацыялістычнае спаборніцтва.

Асьветнікі Полацкага райёну ў дагаворы аб сацыялістычным спаборніцтве аддалі вялікую ўвагу газэце „Савецкая Беларусь".

Канфэрэнцыя пастанавіла:

Кожнаму асьветніку выпісаць з 1 кастрычніка на адзін год газэту „Савецкая Беларусь", пашырыць яе сярод сялянства, наладзіць з рэдакцыяй шчыльную сувязь праз шырокае карэспандыраваньне яе.

Асьветнікі Полацкага р-ну рашылі выклікаць Вульскі р-н пасьледваць іхнаму прыкладу.

НАСТАЎНІК.

Менскае настаўніцтва павінна паказаць узоры прыкладнай працы.

У аўторак 9 верасьня на адчыненым сходзе ячэйкі КП(б)Б Працасьветы быў заслухан даклад Менскай Акрінспэктуры Асьветы аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году і бліжэйшых задачах працы. Ня гледзячы на шырокае абвяшчэньне аб сходзе і запрашэньне настаўніцтва Менскіх школ прыняць удзел у абмеркаваньні гэтага надзвычайна важнага пытаньня, трэба да жалю канстатаваць, што на сход прышла вельмі нязначная параўнальна частка настаўніцтва.

Зусім правільна адзначыў у сваім выступленьні новы інспэктар гарадзкіх школ т. Парук, што ў сучасны момант значная частка настаўніцтва менскіх школ усе свае сілы, усё імкненьне накіравала на „барацьбу" за атрыманьне большага ліку гадзін—лекцый і нічым больш ня цікавіцца. Мы не супроць таго, каб настаўнік меў належную колькасьць гадзін і быў матар'яна забясьпечан, але мы рашуча асуджаем такія паводзіны, калі скурныя інтарэсы заглушаюць усё іншае, калі ў прыцыцы узводзіцца „даёш больш", а іншае нішто не цікавіць. У гэтым падкрэсьліваю нельга абвінаваціць усё настаўніцтва.

Сапраўды, чым тлумачыцца тое, што значная частка настаўніцтва не цікавіцца, ці мала цікавіцца, такімі пытаньнямі як паход за грамату, як сацыялістычнае спаборніцтва, як паляпшаньне якасьці працы ў культасьветных установах і г. д. Нам здаецца тлумачыцца гэта тым, што ёсьць яшчэ надзвычайна шмат сярод некаторай часткі настаўніцтва кансэрватызму, коснасьці, старых традыцый Чэхаўскага чыноўніка ў футляры. Досыць сказаць, што ёсьць у Менскіх школах такія настаўніцы, якія за 10 год свае працы ні адзін раз ня былі ў Доме асьветы. Як можа такая настаўніца ў сваю працу ўносіць новае, што выпрацоўваецца агульным асьветніцкім калектывам? Гэта не настаўніца, а стары хлам, які трэба выкінуць з школы.

Сучасны тэмп сацыялістычнага будаўніцтва з фармальнымі, няўважлівымі адносінамі да працы і да сучасных задач мірыцца ня можа. Сучасная эпоха патрабуе жывой працы, накіраванай на вырашэньне задач рэканструкцыі нашай гаспадаркі, задач культурнай рэвалюцыі. А вырашэньне гэтых задач патрабуе не фармальных адносін да працы, не фармальнага выкананьня абавязкаў „абы дзень да вечара", а энтузіязму, сьвядомай адданасьці, актыўнасьці ў справе перамог на фронце нашага будаўніцтва. Мы на гэтым завострым увагу асьветніцкай масы тым больш, што самі асьветнікі на сваіх сходах, канфэрэнцыях, зьездах не адзін раз у сваіх дэклярацыях гаварылі аб гэтым.

Асноўнае на што ў сучасны момант павінна быць зьвернута асаблівая ўвага—гэта на разгортваньне сацыялістычнае спаборніцтва ў культасьветных установах. Рабочая кляса ў сваёй асноўнай масе праводзячы сацыялістычнае спаборніцтва і зараджаная працоўным энтузіязмам паказала надзвычайна добрыя ўзоры працы. Настаўніцтва таксама павінна паказаць узоры прыкладнай працы на культурным фронце. Аб'ектамі спаборніцтва могуць быць: найлепшая пастаноўка выхаваўчай працы ў школах, поўны ахоп школаю дзяцей беднаты і дапамога ім, праца сярод бацькоў вучняў, ліквідацыя няпісьменнасьці сярод насельніцтва, дапамога ў працы піянэрам і самакіраваньню, найлепшае скарыстаньне вучэбнага часу і г. д.

Да жалю трэба адзначыць, як гэта выявіла на сходзе, што сацыялістычнае спаборніцтва яшчэ не разгарнулася шырока ў Менскіх школах (выключэньне дашкольныя ўстановы, дзе ўжо гэта праца разгарнулася), а між тым навучальны год ужо распачаўся. Саюзу працасьветы і акрінспэктуры трэба перабудаваць сваю працу ў адпаведнасьці задачам, якія высоўваюцца сучаснасьцю. Трэба канстатаваць, што ні саюз, ні акрінспэктарыят яшчэ не зьяўляюцца тымі жывымі, гібкімі органамі, якія-б мабілізавалі ўсю асьветніцкую масу на вырашэньне гэтых задач.

Час не чакае, навучальны год распачаўся, вось чаму цяпер асабліва павінна быць завострана ўвага на ўсіх вузлавых пытаньнях нашай працы. Праводзячы практычную працу, мы павінны памятаць асноўнае: **чоткасьць клясавай лініі ў працы, рашучая барацьба з усялякімі скажэньнямі пралетарскай ідэолёгіі праз шырокае разгортваньне самакрытыкі.**

Настаўніцтва менскіх школ павінна паказаць лепшыя ўзоры працы.

Z.

Праца ў школах пачалася.

(Азарыцкі райён, Мазыршчына).

Асьветнікі выконваюць пастановы вясеньняй канфэрэнцыі аб своечасовым пачатку навучальнага году. Ужо распачалі працу шэраг школ.

Па астатніх школах райёну ідзе падрыхтоўчая праца да адчыненьня новага навучальнага году. Тормазамі да своечасовага пачатку заняткаў па ўсіх школах, трэба лічыць: познае ўкамплектаваньне школ настаўніцкім складам, несвоечасовым правядзеньнем рамонту ў частцы школ райёну і тым, што адпаведныя ўстановы не паклапаціліся даслаць у школы пісьмовыя прылады. Падручнікі школы атрымалі своечасова. **Т. Кулакоў.**

Месячнік „За грамату" і задачы грамадзкасьці.

З першага верасьня па Беларусі распачаўся месячнік „За грамату", у задачу якога ўваходзіць праверыць нашу гатоўнасьць да пачатку навучальнага году ў ліквпунктах і школах малапісьменных, а разам з тым пры дапамозе грамадзкасьці выправіць тыя прабелы, якія маюцца на мясцох.

Прашло ўжо дзесяць дзён месячніку за грамату, а калі мы пачнем падводзіць вынікі праробленай працы па г. Менску і Менскай акрузе, то трэба зазначыць, што прароблена надзвычайна мала.

Возьмем Гомель, там падрыхтоўка да пачатку навуч. году праведзена ў дастатковай меры на працягу летняга часу як у горадзе, так і на вёсцы.

Трэба зазначыць, што сама падрыхтоўка насіла ня вузка ведамсьцьвенны характар, а была прыцягнута шырокая савецкая грамадзкасьць да ўдзелу ў падрыхтоўцы і самой працы ў будучым. Як вынік добра праведзенай працы маем такія зьявішчы, што настаўніцкія канфэрэнцыі Гомельшчыны робяць пастановы правесьці поўную ліквідацыю няпісьменнасьці. Магчыма многія скажуць, што пастановы Гомельскіх настаўнікаў гэта прыгожы сказ, яны ўзялі на сябе такі абавязак, які цяжка выканаць. Той, хто будзе так разважаць эробіць памылку, бо ўмовы для правядзеньня гэтай працы па Гомельскіх райёнах і ўсіх райёнах ёсьць.

Перад усімі акругамі, усімі райёнамі на сёньняшні дзень стаіць пытаньне раўніцца па Гомельшчыне, зьнішчыць хуткім тэмпам няпісьменнасьць і ўзьняўшы культурны ўзровень насельніцтва мы тым самым будзем дапамагаць пасьпяховасьці нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

На мяйсцох у райёнах і с.-с. нам трэба праверыць нашу падрыхтаванасьць да пачатку навучальнага году, як мы задаволены падручнікамі, ці маюцца ў нас кадры, ці намечана ў нас сетка—гэта тыя задачы, якія ставіць перад намі жыцьцё і савецкая ўлада.

Абмежавацца толькі тымі матар'яльнымі сродкамі, якія даюцца па бюджэту для правядзеньня ліквідацыі няпісьменнасьці мы ні можам і не павінны. Наша задача прыцягнуць усіх да гэтай справы.

Калі настаўнік зможа кіраваць з мэтадычнага боку, то камсамол і актывісты змогуць праводзіць арганізацыйную працу, як падбор памяшканьняў, задавальненьне падручнікамі, правядзеньне самога камплектаваньня ліквпунктаў, разгортваньне сеткі ліквпунктаў, груп і індывідуальнага навучаньня.

Застаўшыяся тры тыдні нам трэба выкарыстаць поўнасьцю ў галіне падрыхтоўкі заняткаў у ліквпунктах. Трэба прыцягнуць да гэтай справы шырокую грамадзкасьць.

Прыклад Гомельскіх настаўнікаў узяўшых на сябе абавязак поўнай ліквідацыі няпісьменнасьці не павінен застацца ў баку ад іншых асьветнікаў Беларусі.

Нізавыя ячэйкі „ПН" павінны быць штурхачом пытаньняў па ліквідацыі няпісьменнасьці, вызначыць канкрэтнае мейсца сваім членам у ліквідацыі няпісьменнасьці, узмацніць свае шэрагі новымі членамі, каб ахапіць большыя вучасткі працы.

Толькі пры актыўным удзеле ўсёй савецкай грамадзкасьці мы зможам выканаць тыя задачы, якія паставіла перад намі партыя і савецкая ўлада ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці. Ульянін.

Дайце добрага актыўнага настаўніка.

(Самахвалавіцкі райён, Меншчына).

У пасёлку Скарынічы, Падгайскага сельсавету ёсьць школа, ну, а раз ёсьць школа, то вядомая справа, што ёсьць і настаўнік, які павінен быў-бы паказаць сваю актыўнасьць у грамадзкай працы, як і ўсюды робіць добрыя настаўнікі.

У Скарынінскай школе наглядаецца зусім адваротнае. Настаўніца Мацюта Н. зусім ня цікавіцца выхаваўчай працай сярод вучняў у школе. Нават сяляне пасёлку Скарынічы кажуць, што, як да яе пасылаць вучыцца дзяцей, то няхай сядзіць лепш дома, карысьці больш будзе.

Школа знаходзіцца ў дрэнным становішчы. Патрэбен рамонт, але яна гэтым ня цікавіцца. Агульны сход сялян пас. Скарынічы пастанавілі зьняць яе з працы, і перадалі заяву ў сельсавет. Сельсавет пераслаў гэту заяву ў РВК, але да гэтага часу нічога ня чуваць, што зроблена па заяве сялян.

Селянін.

АБ ПРАВЫМ УХІЛЕ, СТАНОВІШЧЫ І ЗАДАЧАХ ЛКСМБ.

У сувязі з заслуханымі Бюро ЦК ЛКСМБ на сваім пасяджэньні вынікамі агляду комсамольскай арганізацыі Беларусі Цэнтральным Камітэтам УсеЛКСМ і ў сувязі з пастановамі верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б,—Бюро ЦК ЛКСМБ пастанаўляе:

1. Разам са здаровым у асноўным політычным становішчам Беларускай арганізацыі комсамолу, разам з згуртаванасьцю, праяўленай арганізаванасьцю ў барацьбе на працягу гадоў з контр-рэвалюцыйным трацкізмам і яго рэшткамі і выдучайся зараз рашучай барацьбой супроць правага, яўна опортуністычнага ўхілу і прымірэнцкіх да яго адносін, як галоўнай небясьпекі сучаснасьці ў партыі і камсамоле мы маем рад прарываў, фактаў спаўзаньня ў асобных мясцох з клясавых пазіцый. Гэтыя факты скрыўленьня клясавай лініі перарасьлі ў яскравыя правы ўхіл на практыцы, (а гэты правы ўхіл у шэрагу месц перарос у клясавую здраду (Суражская, Межанская, Глуская і Калінкавіцкая справы). Інакш кажучы словамі т. Косарава ў шэрагу мясцовых арганізацый „кулак, клясаварожы элемэнт атрымаў легальную магчымасьць змагацца супроць нас, савецкай улады, пры гэтым ён (кулак) карыстаецца сілай і вагою нашай арганізацыі".

У вёсцы разам з цэлым шэрагам фактаў скажэньня клясавай пралетарскай лініі ў нашай працы, разам з момантамі актыўнага супроцьдзейнічаньня і нежаданьня падтрымаць лінію партыі на калектывізацыю і пагалоўнае каапэраваньне бедняцка-серадняцкіх мас вёскі, мы маем факты, што на працягу цэлага шэрагу год многія ячэйкі наперакор цьвёрдай установы ЦК ЛКСМБ аб калектывізацыі камсамольскіх гаспадарак скажалі лёзунг партыі ў гаспадарчым будаўніцтве і пайшлі на лініі ўзмацненьня сваіх уласных гаспадарак, адмаўляючыся ісьці ў калектыўныя гаспадаркі. Адзэй з прычын усяго гэтага зьяўляецца слабасьць нашай работы па клясаваму выхаваньню камсамольцаў і беспартыйнай моладзі.

У часткі камсамольцаў рабочых і беспартыйнай моладзі ёсьць моманты неразуменьня ўсёй сутнасьці сацыялістычнай рацыяналізацыі вытворчасьці, а адсюль праяўленьні ў значным памеры фактаў вузка-цэхавых настрояў, хвасьцізму, рвацтва, недысцыплінаванасьці. Гэтыя гібельныя для справы сацыялістычнага будаўніцтва настроі хоць і характэрны ў большай ступені для адсталых груп рабочых і моладзі, якая прышла нядаўна ў вытворчасьць з вёскі і мястэчку, усё-ж награжаюць і могуць сарваць наш узлёт у сацыялістычным будаўніцтве.

Усе арганізацыі абавязаны праз ленінскі мэтад сацыялістычнага спаборніцтва зьнішчаць прагулы, брак, нядбайнасьць, рвацтва, недысцыплінаванасьць у прамысловасьці: шырока ўцягнуць комсамол і рабочую моладзь у сацыялістычнае спаборніцтва, рашуча змагацца з хвасьцізкімі настроямі, за пролетарскую дысцыпліну ў працы за зьніжэньне сабекошту, палепшаньне якасьці прадукцыі, рацыяналізацыю вытворчасьці, за поўнае выкананьне пяцігодкі.

У вёсцы камсамол павінен стаць сапраўдным застрэльшчыкам будаўніцтва калектыўнай і савецкай гаспадаркі, рашуча змагацца за клясавую пролетарскую лінію супроць кулака, супроць хутарское гаспадаркі, за сацыялістычную перабудову вёскі.

2. Бюро ЦК ЛКСМБ канстатуе недастатковае цьвёрдае і пасьлядоўную арыентыроўку саюзу на напрымірымую барацьбу з тэорыяй і практыкай правага ўхілу і прымірэнцтва да яго. Гэта асабліва выявілася ў нэйтральных адносінах да „прышчэпаўшчыны", права ўкланісцкай палітыкі Наркамзему, які кіруючыся ў сваёй шмат-гадовай дзейнасьці буржуазнымі тэорыямі аб „асабліўых шляхох разьвіцьця сельскай гаспадаркі ў Беларусі", тэорыяй „узбагачайцеся", тэорыяй пашырэнага НЭП'у, на практыцы спрыяў узмацненьню эканамічнай магутнасьці кулацтва, росту хутароў і тым самым урэшце спрыяў узмацненьню палітычнай актыўнасьці кулака і яго ідэолёгаў. Усё гэта зьяўлялася тормазам ажыцьцяўленьня лёзунгу аб калектывізацыі вёскі.

Такая-ж права-ўхілісцкая лінія праводзілася і ў Белсамрамкаапэрацыі, дзе рабілася стаўка на прыцягненьне сродкаў і ініцыятывы прыватніка, праз уцягненьне яго ў каапэрацыю, што прывяло да засьмечанасьці самрамкаапэрацыі нэпманскімі і кулацкімі элемэнтамі і да захопу імі кіраўніцтва ў паасобных зьвеньнях. Пастаўленыя партыяй на чале Белсамрамкаапэрацыі Мар'ясін і Зэльдовіч апынуліся на паваду у клясава-варожых нам элемэнтаў.

3. Камсамол Беларусі хаця і дабіўся некаторых посьпехаў у галіне практычнага правядзеньня нацыянальнай палітыкі партыі ў частцы аўладаньня беларускай культурай і мовай, усё-ж такі Бюро ЦК ЛКСМБ прызнае гэтыя посьпехі ацэнкі мізэрнымі. Мы проста заяўляем, што камсамольская арганізацыя часам стаяла ў баку ад барацьбы з падняўшым галаву нацыянал-дэмакратызмам, які зьяўляецца правяй абвостранай клясавай барацьбы. Камсамол своечасова не рэагаваў на спробы нацыянал-дэмакратаў і шавіністаў усіх колераў стварыць адзіны нацыянальны фронт; на контррэвалюцыйныя выступленьні трох беларускіх пісьменьнікаў Зарэцкага, Александровіча і Дудара ў „Савецкай Беларусі"; на выступленьні Тодара Глыбоцкага (таго-ж Дудара), Жылуновіча і Зарэцкага ў тэатральнай дыскусіі, дзе яны праводзілі погляды аб самабытнасьці беларускай культуры; на выступленьне ў 1927 г. пяці камуністаў і двух беспартыйных (з якіх адзін былы прэм'ер белагвардзейскага беларускага ўраду) у „Савецкай Беларусі", накіраванае супроць ЦО КП(б)Б „Зьвязда", сыстэматычнае цкаваньне ЦО „Зьвязда" з боку нацыянал-дэмакратаў; шэрагу іншых фактаў, дзе паміж асобнымі беларусамі, партыйцамі ўхілістымі і буржуазнымі нацыянал-дэмакратамі сьціраліся ўсе межы. Камсамольская арганізацыя ня была ўзброена для дачы адпору наступу клясавага ворага на ідэолёгічным фронце. Камсамол яшчэ і зараз ня ўсё ўжывае для таго, каб па бальшавіцку, сьмела разгарнуць барацьбу супроць уняволеньня нацыянал-дэмакратычнай ідэолёгіі ва ўсё культурна-нацыянальнае будаўніцтва і школы. Трэба проста сказаць, што на паасобныя зьвеньні ЛКСМБ маецца моцны ўплыў нацыянал-дэмакратычных буржуазных элемэнтаў.

Орган ЦК ЛКСМБ—„Чырвоная Зьмена" трымалася „нэйтральнасьці" ў адносінах да нацыянал-дэмакратычных выступленьняў у Беларусі. Тут патрэбен сапраўды самы рашучы пералом.

4. Барацьба супроць нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў усіх адценьняў ёсьць адна з асноўных задач КП(б)Б і камсамолу. Гэта барацьба не на адзін дзень. Патрэбна рашучая мабілізацыя мас камсамолу пад кіраўніцтвам КП(б)Б супроць нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў. Бальшавіцкая непрымірымасьць да нацыянал-дэмакратычнай ідэолёгіі клясавага ворага. Ва ўсёй нашай выхаваўчай і палітыка-асьветнай працы трэба рашуча выкрываць нацыянал-дэмакратызм, трэба рашуча заняцца пераглядам нашых падручнікаў, дапаможнікаў і літаратуры, якая выдана і выдаецца зараз Белдзяржвыдавецтвам, каб забясьпечыць сапраўднае камуністычнае выхаваньне падрастаючага пакаленьня. Камсамол ва ўсіх порах савецкага і партыйнага жыцьця павінен з няпрымірымай стойкасьцю выкрываць і рашуча змагацца з усялякімі хістаньнямі ад ленінскай лініі партыі як на культурным фронце, так і гаспадарчым. Камсамольскія ячэйкі ВНУ, тэхнікумаў, профшкол і другіх навучальных устаноў павінны даваць рашучы адпор рэакцыйнай прафэсуры, нацыянал-дэмакратычным настроям, шавіністычным праявам усіх адценьняў. Асаблівую ролю павінен адыграць камсамол у справе дапамогі партыі па выхаваньню пралетарскіх кадраў.

5. Узмацненьне актыўнасьці нацыянал-дэмакратызму, кансалідацыя яго сіл, яго ваяўнічасьць тлумачыцца нашым рашучым наступленьнем на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі і выцякаючым адгэтуль абвастрэньнем клясавай барацьбы.

Нацыянал-дэмакратычныя і іншыя варожыя нам элемэнты рабілі і робяць націск і імкнуцца аўладаць пазіцыямі на культурным фронце, што знайшло сваё адлюстраваньне ў цэлым шэрагу скажэньняў клясавае лініі кіраўніцтвам Наркамасьветы, дзякуючы працаваўшым там Жылуновічам ды іншым. НК Асьветы Беларускай ССР ня толькі не забясьпечыў цьвёрдага выкананьня партыйных пастаноў у культурна-нацыянальным будаўніцтве, але сваёй лібэральнай лініяй прыводзіў падчас да змычкі з нацыянальна буржуазнымі элемэнтамі, садзейнічаў поўнаму выхалашчаньню ленінскай лініі ў нац. палітыцы партыі. НКА не зрабіў таго, што ён абавязан быў зрабіць для падрыхтоўкі пралетарскіх навуковых кадраў, разьвіцьця пралетарскай літаратуры, мастацтва і тэатру. Такая лібэральная палітыка і практыка тлумачыцца яшчэ і тым, што ў БССР да гэтай пары ня было рашучага курсу на поўнае аўладаньне пралетарыятам усіх вышэйшых культурнага будаўніцтва, а наадварот, пераацэньвалася, а нярэдка прыраўнівалася да ролі пралетарыяту роля нацыялістычнай інтэлігэнцыі.

Маецца праяўленьне нацыянал-дэмакратычных плыняў таксама і ў мастацкай літаратуры ў частцы прадукцыі „Узвышша", „Полымя", у тэатры, кіно, гістарычнай навуцы, мовазнаўстве, у навуковых творах (адкрыта буржуазныя „працы" Лёсіка, Некрашэвіча, Жылуновіча, Байкова, Шырэева, Клейнборта, Кісьлякова, Гарэцкага ды іншых).

БелАПП, роля якога ў справе барацьбы за пралетарскую літаратуру набывае выключна важнае значэньне, да апошняга часу амаль ня меў зусім падтрыманьня з боку камсамолу і іншых арганізацый. Стварыць спрыяючыя ўмовы для працы БелАПП, заняцца выхаваньнем, яго кадраў,—зьяўляецца важнейшай задачай камсамолу.

6. Усе гэтыя выкрыўленьні ў нацпытаньні па сваёй сутнасьці зьяўляюцца ні чым іншым як праявамі правага апартуністычнага ўхілу ад ленінскай лініі партыі, аб чым яскрава гаварыў т. Гамарнік ...„ці можна ...э гэтыя ўхілы ад нашай нацпалітыкі з боку камуністаў увязаць з агульнымі ўхіламі ў партыі? Так, бясспрэчна, можна і трэба, бо ўсё гэта выяўленьне правага ўхілу ў партыі". Больш таго праяўлены правага ўхілу ў нацпытаньні пераносілася ў практычную работу, чым супроцьстаўляліся на практыцы генэральнай лініі партыі. Вось чаму ЦК ЛКСМБ лічыць не сумясьцімым прабываньне ў радох КП(б)Б і ЛКСМБ тых, хто ідэёва і практычна змыкаецца з нацыянал-дэмакратамі, хто пралае такім чынам інтарэсы пралетарскае дыктатуры. ЦК ЛКСМБ заклікае ўсю арганізацыю з базьшавіцкай непрымірымасьцю змагацца за ленінскую лінію партыі. За прынцыпы бальшавізму ў нацыянальным пытаньні, супроць правага апартунізму. Супроць блаціруючыхся з нацыянал-дэмакратамі і тым самым дапамагаючых клясаваму ворагу.

Праводзячы энэргічную барацьбу з правай апазіцыяй, як галоўнай небясьпекай у партыі і камсамоле, камсамол у той-жа час не павінен паслабляць сваёй увагі да барацьбы з рэшткамі контр-рэволюцыйнага трацкізму і з „левымі" заскокамі тыпу Шацкіна—Стэна.

7. Барацьба за генэральную лінію партыі, змаганьне з скажэньнямі клясавай лініі і рашучае правядзеньне курсу на індустрыялізацыю краіны, на калектывізацыю сельскае гаспадаркі, на выкананьне і выкананьне з правышэньнем у тэмпах нашай пяцігодкі, магчыма толькі

Законы і загады ўраду БССР.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

ПРА САМААБКЛАДАНЬНЕ НАСЕЛЬНІЦТВА.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў **пастанаўляюць:**

1. Для задаваленьне мясцовых гаспадарчых, культ-асьветных, санітарных і дабрабытных патрэб сельскага і местачковага насельніцтва, а таксама насельніцтва сельскіх саветаў, якія знаходзяцца ў межах гарадоў, можа ўстанаўляцца абавязковае для ўсіх грамадзян данага населішча самаабкладаньне ў межах і ў парадку, прадугледжаных гэтаю пастановаю:

а) на арганізацыю, утрыманьне і абслугоўваньне (будаваньне новых, дабудаваньне няскончаных, пашырэньне, найманьне, капітальны і бягучы рамонт будынкаў, абсталяваньне, апал і асьвятленьне) гаспадарчых, культурна-асьветных і санітарных устаноў мясцовага грамадзкага значэньня: школ, хат-чытальняў, клюбаў, чырвоных куткоў, дзіцячых дамоў, ясьляў і пляцовак, больніц, доктарскіх, фэльчарскіх, вэтэрынарных і агранамічных пунктаў, дамоў для інвалідаў і для састарэлых, начлежных дамоў, лазьняў і хлебазапасных магазынаў;

б) на ўпарадкаваньне населішчаў: капаньне і ўтрыманьне ў парадку студняў, грамадзкіх сажалак, пляцоў магільнікаў для здохлай жывёлы, плошчаў грамадзкага карыстаньня (выгонаў, лугоў), а таксама на ўтрыманьне начных і палявых вартаўнікоў;

в) на правядзеньне новых, утрыманьне і рамонт існуючых дарог, мастоў, грэбляў перапраў, і перавозаў што маюць мясцовае грамадзкае значэньне;

г) на супроцьпажарныя мерапрыёмствы; будаваньне, капітальны і бягучы рамонт і гаспадарчае ўтрыманьне пажарных дэпо і хлявоў, на набываньне і ўтрыманьне супроцьпажарных машын і прыладаў, на ўтрыманьне пажарных вартаўнікоў;

д) на ўтрыманьне лясьнікоў і лесакультурныя работы ў лясох мясцовага значэньня.

2. Забараняецца самаабкладаньне на патрэбы адміністрацыйнага характару (аплата работнікаў мясцовых органаў улады: райённага выканаўчага камітэту, сельскага савету, міліцыі, сельскіх выканаўцаў і інш. утрыманьне і абсталяваньне для іх памяшканьняў, а таксама канцэлярскія, раз'ездныя і іншыя выдаткі) і на ўтрыманьне службовага пэрсаналу культурных і гаспадарчых устаноў, якія існуюць і ўзьнікілі па сродкі самаабкладаньня.

3. Агульны разьмер самаабкладаньня на адзін год ня можа перавышаць 50 проц. наступных сум: а) агульнае сумы сельска-гаспадарчага падатку, якая павінна быць выплачана ўсімі гаспадаркамі данага населішча ў даным акладным годзе і б) тых сум сельска-гаспадарчага падатку, якія былі-б налічаны з платнікаў падаходнага падатку, калі-б іх даход абкладаўся ў разьмерах і паводле ставак, устаноўленых для сельска-гаспадарчага падатку.

4. Агульны сход можа прыняць самаабкладаньне на патрэбы, якія нельга задаволіць за адзін год, не выходзячы з гранічных разьмераў самаабкладаньня. У такім разе пастанова аб самаабкладаньні дзейнічае і на будучы час і ня можа быць скасавана, пакуль ня будзе задаволена мэта самаабкладаньня. Але для данага году агульная сума самаабкладаньня ня можа перавышаць гранічнага разьмеру, паказанага ў арт. 3-м гэтай пастановы і вызначаецца сходам з такім разьлікам, каб гранічны разьмер самаабкладаньня ня быў парушаны і каб у вызначаны тэрмін мэта самаабкладаньня была выканана.

Калі самаабкладаньне прынята больш як на адзін год, дык пастанова сходу набывае сілу толькі пасьля зацьверджаньня яе акруговым выканаўчым камітэтам.

5. Самаабкладаньне дазваляецца і ў грашовай і ў натуральнай форме, а таксама і ў форме працоўнага ўдзелу, прычым натуральныя ўзносы і працоўны ўдзел пералічваюцца ў грошы паводле правілаў, якія ўстанаўліваюцца Народным Камісарыятам Фінансаў БССР.

6. Пытаньне аб устанаўленьні самаабкладаньня падніімаецца па ініцыятыве сельскага (местачковага) савету, паасобных грамадзян або груп грамадзян і грамадзкіх арганізацый і вырашаецца на агульных сходах грамадзян, якія склікае сельскі або (местачковы) савет. Для ўстанаўленьня самаабкладаньня патрэбна прысутнасьць на агульным сходзе ня менш паловы агульнага ліку грамадзян данага населішча, што карыстаюцца выбарчымі правамі.

Калі на першы агульны сход грамадзян па пытаньні аб самаабкладаньні зьявіцца менш паловы агульнага ліку грамадзян, што маюць выбарныя правы, дык склікаецца другі агульны сход. Для вырашэньня пытаньняў аб самаабкладаньні на другім сходзе павінна прысутнічаць ня менш 1/3 часткі ўсяго ліку грамадзян, што маюць выбарныя правы.

7. Пытаньне аб увядзеньні самаабкладаньня і ўсе іншыя пытаньні на сходзе па самаабкладаньню вырашаюцца простай большасьцю галасоў грамадзян, што маюць выбарныя правы.

8. Калі трэба задаволіць агульную патрэбу двух або некалькіх населішчаў, дык пытаньне аб увядзеньні самаабкладаньня можа вырашацца і на агульных сходах грамадзян кожнага населішча ў паасобку і на аб'яднаным агульным сходзе грамадзян усіх зацікаўленых населішчаў, з тым, каб на агульным сходзе прысутнічала ня меньш паловы агульнага ліку грамадзян, якія карыстаюцца выбарнымі правамі з кожнага зацікаўленага населішча.

Калі самаабкладаньне на агульныя патрэбы некалькіх населішчаў абмяркоўваецца на паасобных сходах кожнага з іх, дык пытаньне аб правядзеньні самаабкладаньня вырашаецца па агульнай колькасьці галасоў за і супроць на ўсіх сходах разам.

9. Агульны сход павінен вырашаць наступныя пытаньні: а) мэты самаабкладаньня, б) агульны разьмер яго ў грашовай форме, в) формы самаабкладаньня (грашмі або натураю, ці мяшанаю формаю), г) гранічны тэрмін уносаў самаабкладаньня, д) катэгорыі гаспадарак і асоб, якія поўнасьцю або часткова вызваляюцца ад самаабкладаньня. Гранічны тэрмін вызначаецца паводле пляну работ па самаабкладаньні і ня можа перавышаць двух месяцаў, лічачы з дню пастановы агульнага сходу.

Усе вырашаныя пытаньні павінны быць запісаны ў пастанове, прынятай агульным сходам і падпісанай прэзыдыумам сходу. Да пастановы павінен быць дададзены пратакол, у якім адзначаюцца: а) лік грамадзян данага населішча, якія маюць выбарныя правы; б) лік прысутных на агульным сходзе грамадзян, якія маюць выбарныя правы; в) лік грамадзян, якія галасавалі за і супроць пастановы.

10. Не пазьней, як праз 7 дзён ад дню атрыманьня пастановы агульнага сходу грамадзян населішча аб самаабкладаньні, сельскі (местачковы) савет робіць раскладку агульнай сумы самаабкладаньня паміж паасобных гаспадарак і грамадзян данага населішча. Пры гэтым за адзін пай самаабкладаньня лічыцца столькі капеек, колькі процантаў складае сума прынятага самаабкладаньня ў дачыненьні да сум сельска-гаспадарчага падатку, вылічаных паводле артыкулу 3-га гэтае пастановы.

11. Пры раскладцы самаабкладаньня гаспадаркам асобам з розных катэгорый насельніцтва налічаецца наступная колькасьць паёў:

а) гаспадаркам, якія плацяць сельска-гаспадарчы падатак, столькі паёў, колькі рублёў сельска-гаспадарчага падатку яны павінны плаціць, апроч сьвідак і льгот, зробленых на час раскладкі самаабкладаньня;

б) гаспадаркам, якія не плацяць сельска-гаспадарчага падатку, як незаможныя, па два паі на кожную;

в) гаспадаркам, з якіх зьнят увесь аклад сельска-гаспадарчага падатку па іншых льготах, столькі паёў, колькі рублёў складае палавіна налічаных з іх акладаў сельска-гаспадарчага падатку;

г) платнікам падаходнага падатку, столькі паёў, колькі рублёў сельска-гаспадарчага падатку яны плацілі-б калі-б іх даход абкладаўся ў тых частках і паводле тых ставак, якія ўстаноўлены для сельска-гаспадарчага падатку;

д) членам тых саматужна-рамесных кааперацыйных арцеляў, якія не дзеляць прыбытку па паёх, калі яны не плацяць сельска-гаспадарчага і падаходнага падатку,—па два паі, калі яны маюць да 50 рублёў у месяц даходу і па тры паі, калі яны маюць звыш 50 р. у месяц даходу;

е) саматужнікам, рамесьнікам і інш. асобам, не паказаным у гэтым артыкуле, калі ўсе гэтыя асобы не плацяць сельска-гаспадарчага і падаходнага падатку ад двух да пяці паёў на кожнага—па погляду сельскага (местачковага) савету;

ж) асобам, якія атрымоўваюць непрацоўныя даходы і не абкладаюцца сельска-гаспадарчым падаходным падаткам,—ад пяці да дванаццаці паёў на кожную, па погляду сельскага (местачковага) савету.

Рабочыя і служачыя, крыніцай існаваньня якіх зьяўляецца выключна заработная плата, не прыцягваюцца да самаабкладаньня. Да самаабкладаньня не прыцягваюцца таксама савецкія гаспадаркі, у тым ліку гаспадаркі дзіцячых дамоў, сельска-гаспадарчых школ і г. д.

Агульны сход грамадзян данага населішча, а таксама і пленум сельскіх і местачковых саветаў маюць права не прыцягваць да ўдзелу ў самаабкладаньні паасобныя гаспадаркі і асоб, з паказаных у літарах „б" і „в" гэтага артыкулу, а таксама гаспадаркі вайскоўцаў, інвалідаў вайны і працы і чырвоных партызан.

12. Сельскі (местачковы) савет мае права на падставе хадайніцтваў паасобных гаспадарак, або асоб дазволіць замену вызначанай агульным сходам формы самаабкладаньня іншаю формаю, напрыклад, замест грашовай—натуральныя ўносы альбо працоўны ўдзел. Пры такой замене сельскі (местачковы), савет павінен, галоўным чынам, браць пад увагу інтарэсы занепалых груп насельніцтва.

13. Раскладка самаабкладаньня не пазьней як праз тыдзень з дню зацьверджаньне яе сельскім (местачковым) саветам абавяшчаецца насельніцтву.

14. На працягу двух тыдняў ад дню абвяшчэньня раскладкі зацікаўленыя грамадзяне маюць права падаць у сельскі (местачковы) савет скаргі на пастанову аб самаабкладаньні наогул, а таксама аб раскладцы.

15. Пасьля сканчэньня тэрміну, паказанага ў папярэднім артыкуле сельскі (местачковы) савет накіроўвае ў райённы выканаўчы камітэт пастанову агульнага сходу грамадзян аб самаабкладаньні з сваім заключэньнем, раскладку, яго і ўсе атрыманыя скаргі.

16. Райённы выканаўчы камітэт можа скасаваць пастанову сходу грамадзян аб самаабкладаньні ў наступных выпадках: а) калі агульны сход грамадзян, які прыняў пастанову аб самаабкладаньні, ня меў законнай сілы, альбо калі была грунтоўна парушана гэтая пастанова; б) калі мерапрыёмствы, для ажыцьцяўленьня якіх зроблена самаабкладаньне, не прадугледжаны гэтай пастановай; в) калі перавышан гранічны разьмер самаабкладаньня.

17. Калі неправільна ўстаноўлена раскладка, дык райённы выканаўчы камітэт павінен незалежна ад таго, ёсьць скаргі на раскладку, ці не, зрабіць у ёй патрэбныя зьмены.

18. Калі на працягу двох тыдняў ад дню падачы сельскім (местачковым) саветам у райённы выканаўчы камітэт пастановы агульнага сходу грамадзян аб самаабкладаньні яна ня будзе скасавана райённым выканаўчым камітэтам, а таксама, калі райённы выканаўчы камітэт ня ўнясе зьмен у раскладку, зробленую сельскім (местачковым) саветам, дык пастанова аб самаабкладаньні і раскладка лічыцца зацьверджанымі і зьяўляюцца абавязковымі для ўсіх грамадзян данага населішча.

19. Калі райённы выканаўчы камітэт адмовіцца задаволіць скаргу, дык ён павінен паведаміць скаргніку падставы адмаўленьня. На паказаныя пастановы могуць падавацца скаргі ў акруговы выканаўчы камітэт, пастановы якога зьяўляюцца канчатковымі. Падача скаргі на пастанову райённага выканаўчага камітэту не прыпыняе яго пастановы аб самаабкладаньні.

20. Калі пастанова аб задавальненьні скаргі была прынята пасьля таго, як раскладка набыла сілу, дык сума, унесеная асобаю, што падала скаргу, альбо спагнаная з яе, павінна быць ёй зьвернута.

21. У дачыненьні да сельскіх саветаў, якія знаходзяцца ў межах гарадоў, правы і абавязкі райённых выканаўчых камітэтаў, паказаных у арт. арт. 16, 17, 19 і 26 гэтае пастановы пераходзяць да таго выканаўчага камітэту, або гарадзкога савету, якому сельскі савет беспасрэдна падпарадкаваны.

22. Нядоімкі па самаабкладаньні спаганяюцца сельскім (местачковым) саветам у адміністрацыйным парадку, які ўстаноўлен для спагнаньня падатку.

На нядоімкі па самаабкладаньні налічваецца пеня ў парадку, вызначаным для недоімак па сельска-гаспадарчым падатку.

Калі ў вызначаны тэрмін ня будзе выканана насельніцтвам самаабкладаньне працоўным удзелам, дык кошт такіх работ пераводзіцца асобнаю пастановаю сельскага (местачковага) савету на грошы і спаганяецца паводле гэтага артыкулу.

23. Для ажыцьцяўленьня самаабкладаньня на сельскі (местачковы) савет ускладаецца наступны абавязак: а) устанаўленьне рат для выплаты самаабкладаньня, а таксама тэрміны зьяўленьня грамадзян для працоўнага ўдзелу ў адпаведнасьці з пастановай агульнага сходу аб самаабкладаньні; б) зьбіраньне, захаваньне і падлік сродкаў і матар'ялаў, якія паступаюць у парадку самаабкладаньня; в) вядзеньне патрэбных закупак і заключэньне дагавору паводле пастановы агульнага сходу у адпаведнасьці з чынным законам; г) кіраваньне ўсімі работамі, якія вядуцца ў парадку працоўнага ўдзелу, разьмяркаваньне паасобных абавязкаў паміж грамадзянамі, назначэньне кіраўнікоў работ, падлік зьяўленьня на работу і зробленай работы; д) распараджэньне ўсею маёмасьцю, якая набываецца за кошт самаабкладаньня, а таксама і грамадзкімі капіталамі, якія складаюцца ў парадку самаабкладаньня. Калі самаабкладаньне ўстаноўлена для агульных патрэб некалькіх населішчаў, аб'яднаных рознымі сельскімі саветамі, дык абавязкі, паказаныя ў гэтым артыкуле, ускладаюцца на райённы выканаўчы камітэт.

24. Сродкі, атрыманыя ў парадку самаабкладаньня, могуць выдавацца толькі на мэты, вызначаныя ў адпаведнай пастанове агульнага сходу грамадзян. За парушэньне гэтага правіла вінаватыя прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці.

25. Сельскі (местачковы) савет дае агульнаму сходу справаздачу аб выдаткаваньні сродкаў, атрыманых у парадку самаабкладаньня, а таксама аб вядзеньні работ у парадку працоўнага ўдзелу грамадзян.

26. Агульны нагляд за вядзеньнем самаабкладаньня ўскладаецца на акруговыя і райённыя выканаўчыя камітэты, якія павінны складаць акруговыя і райённыя пляны правядзеньня самабкладаньня.

На рэвізійныя камісіі сельскіх і местачковых саветаў ускладаецца абавязак рэвізаваць усю дзейнасьць сельскіх (местачковых) саветаў па вядзеньню самаабкладаньня.

27. Агульны падлік разьмеру і паступленьня самаабкладаньня арганізуецца Народным Камісарыятам Фінансаў БССР.

28. Самаабкладаньне насельніцтва на грамадзкія патрэбы ў іншых не прадугледжаных арт. 1 гэтае пастановы выпадках дазваляецца толькі на асновах згоды грамадзян, паводле артыкулаў 29—31 гэтае пастановы.

29. Пастановы аб самабкладаньні на мэты, непрадугледжаныя артыкулам 1-м гэтае пастановы, могуць прымацца на сельскіх і іншых сходах грамадзян з дакладным вызначэньнем мэты, агульнага разьмеру і раскладкі самаабкладаньня паміж асобамі, якія галасавалі за іх прыняцьце, а таксама парадку выдаткаваньня і кантролю за выдаткаваньем сродкаў, што паступаюць па самаабкладаньню. Для асоб, якія не ўдзельнічалі на сходах, таксама для асоб, якія ўстрымаліся ад галасаваньня, альбо галасавалі супроць прыняцьця пастановы аб самаабкладаньні, апошняе не абавязкова.

30. Усе спрэчкі, якія ўзьнікаюць па пытаньнях самаабкладаньня, прынятага паводзе арт. 29, могуць вырашацца толькі судом. Ужываньне ў такіх выпадках якіх небудзь мер адміністрацыйнага ўплыву, альбо прымуму не дазваляецца. Удзел сельскіх (местачковых) саветаў і іншых адміністрацыйна-фінансавых органаў у вядзеньні такога самаабкладаньня і ў спагнаньні ўносаў, што належаць з паасобных грамадзян, забараняецца.

31. Выдаткаваньне сродкаў, сабраных паводле арт. арт. 29-30 гэтае пастановы, не на тыя мэты, для якіх яны былі сабраны, выклікае адказнасьць у крымінальным парадку.

32. Гэтая пастанова не пашыраецца таксама і на зборы, якія ўстанаўляюць для сваіх членаў арганізацыі, што маюць паводле сваіх статутаў альбо палажэньняў аб іх, правы абкладаць сваіх членаў зборамі на задавальненьне тых ці іншых патрэб. Гэтыя зборы ўстанаўляюцца і патрыманыя сродкі выдаткоўваюцца ў парадку, прадугледжаным альбо ў спэцыяльным законе, альбо ў статуце, ці палажэньні аб данай арганізацыі.

33. З часу апублікаваньня гэтае пастановы скасаваць наступныя пастановы ЦВК і СНК БССР за 1928 год: 1) за 14 студзеня „Пра самаабкладаньне насельніцтва"; за 11 лютага «Пра зьмену артыкулаў 4 і 10 пастановы ЦВК і СНК БССР» „Пра самаабкладаньне насельніцтва"; 3) за 25 лютага „Пра дапаўненьне артыкулу 3-га пастановы ЦВК і СНК БССР" за 14 студзеня 1928 г. „Пра самаабкладаньне насельніцтва"; 4) за 13 сакавіка „Пра пашырэньне пастановы ЦВК і СНК БССР" пра самаабкладаньне насельніцтва" на насельніцтва мястэчак і на насельніцтва сельскіх саветаў, якія знаходзяцца ў межаў гарадоў; 5) за 26 красавіка „Пра дапаўненьне ўвагаю арт. 16-га пастановы ЦВК і СНК БССР" пра самаабкладаньне насельніцтва"; 6) за 3 лістапада „пра зьмену пастановы ЦВК і СНК БССР" пра самаабкладаньне насельніцтва" (Зб. З. БССР 1928 г. №№ 7, 9, 10, 12, 16, 34 арт. арт. 37, 71, 76, 96, 140 і 317).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Час. Вык. Аб. Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Сташэўскі.**

12 верасьня 1929 г. г. Менск.

ПАПРАЎКА.

Да пастановы ЦВК „Пра падатак з маемасьці, якая пераходзіць у спадчыну і дар. („Савецкая Беларусь" № № 189 і 190).

1) У п. 8-м напісана: „па дзень", а трэба „на дзень".

2) У п. 25-м напісана: „падатак бярэцца ў павялічаным разьмеры", а трэба: „у палавіным".

Рыхтуемся да дню ўраджаю і калетывізацыі.

Учора пад старшынствам Народнага Камісара Земляробства т. **Рачыцкага** адбылася нарада з прадстаўнікоў НКЗ, Белсельтрэсту, Белсельсаюзу, ЦК БСТУ, АКРЗА на падрыхтоўцы да дню ўраджаю і калектывізацыі.

Тав. Міхайлаў паінфармаваў аб пляне арганізацыі дню ўраджаю і калектывізацыі. У кожным райёне намячаецца арганізацыя с.-г. выстаўкі. Дакладчык даводзіць, што месцам выставак трэба абіраць калгасы, груца калгасаў, а то і савгасы. Пасвайму зьместу, выстаўкі павінны адбіваць ня толькі галіны паляводзтва, але і садоўніцтва, гародніцтва, жывёлаводзтва. Асабліва трэба зьвярнуць увагу на дэманстраваньне экспанатаў **сацыялістычнага сэктару.** Выстаўкі павінны цягнуцца 2-3 дні. За выключэньнем экспанатаў па жывёлаводзтву, якія могуць прабыць на выстаўках ня больш 1 дня.

Апрача выставак райённага значэньня пажадана арганізоўваць выстаўкі больш дробнага значэньня ў найбольш аддалённых пунктах.

Дзень ўраджаю і калектывізацыі,— кажа дакладчык,—трэба выкарыстаць ня толькі для дэманстраваньня нашых дасягненьняў у галіне падвышэньня ўраджайнасьці, але выкарыстаць гэтыя выстаўкі для адбору лепшых экспанатаў для Ўсебеларускай с.-г. выстаўкі. Тут-жа трэба запісваць лепшых экспанатаў па жывёлаводзтву.

У дзень ураджаю ў часе выставак трэба будзе арганізоўваць аграінспэктароўкі, дэманстраваць працу трактараў, буйных малатарняў, арганізоўваць сялянскія экскурсіі ў савгасы і калгасы.

Чапы дасьледчыя станцыі таксама павінны прыняць чынны ўдзел у арганізацыі перасовачных выставак, дэманструючы свае дасягненьні ня толькі картаграмамі і дыяграмамі, але і жывымі экспанатамі.

Дзень ураджаю павінен прайсьці пад лёзунгам калектывізацыі.

У спрэчках па дакладу т. Міхайлава выступіла шэраг таварышоў. Тав. Рачыцкі адзначыў, што трэба ўжо распачаць падрыхтоўчую работу па арганізацыі с.-г. выставак. Вакол гэтага пытаньня трэба мабілізаваць шырокую думку грамадзкасьці, друк, кіно, радыё.

— У дзень ураджаю,—кажа прамоўца,—мы павінны шырока папулярызаваць мераприёмствы нашай 5-ці годкі ў галіне сельскай гаспадаркі. Мы павінны падвесьці вынікі, якія мы ўжо маем, за першы год ажыцьцяўленьня 5-цігодкі, а дасягненьні ёсьць. У гэты дзень трэба праверыць, як праводзілася выкананьне аграмінімуму, ажыцьцяўленьне спаборніцтва.

Цэнтрам увагі с.-г. выставак павінен заняць сацыялістычны сэктар. Важна дэманстраваць ня толькі экспанат, але трэба паказаць форме сельскай гаспадаркі, як маць ураджай з большым і масавых разьмерах, а гэта магчыма біцца толькі пры калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Асабліва трэба зьвярнуць увагу на папулярызацыю ідэй калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Дзень ураджаю павінен стаць днём масавага абмеркаваньня калектывізацыі, масавага замацаваньня гаспадарчага руху.

У адпаведнасьці з тымі задачамі, якія мы ставім перад днём ураджаю, трэба ўжо распачаць падрыхтоўку гэтага сьвята. У гэту кампанію мы быць уцягнуты шырокія аграпрацаўнікоў, рабочых і шэфтаварыстваў.

— Сёлета,—кажа т. Рачыцкі,—перакрыць сабатаж кулакоў, злак ня хоча весьці на выставку бычка ці сьвінку абыйдзіцца яго. У нас ужо ёсьць чым хвалі. Нашы калгасы, савгасы і сераднякіцкія масы могуць значнымі дасягненьнямі ў сельскіх мэтадаў вядзеньня сельскай гаспадаркі у галіне падвышэньня ўраджайнасьці.

ХРОНІКА.

Музычную культуру—у масы рабочых.

Канцэрты ў абедзенны перапынак на прадпрыемствах.

Згодна дырэктыў ЦК саюзу, ЦП саюзу працмастацтва ў парадку садружэства абслугоўвае мастацкімі выступленьнямі ў час абедзенага перапынку прадпрыёмстваў саюзу будаўнікоў. Як паказала практыка мастацкае абслугоўваньне рабочых у час абедзянага перапынку мае вялікае культурна-выхаваўчае значэньне.

Саюз зараз распрацоўвае пытаньне аб пашырэньні гэтага вопыту па іншым прадпрыёмствам. Для шырокага абгаварэньня пытаньня склікаецца ў хуткім часе культнарада з удзелам прадстаўнікоў ФЗМК.

Пытаньне аб мэтазгоднасьці правядзеньня абедзенных канцэртаў будзе шырока абгаворана сярод рабочых.

Працаўнікі мастацтва—да манэўраў Чырвонай арміі.

Саюзам Белпрацмастацтва вылучаны дзьве ўдарныя мастацкія групы ў ліку 29 асоб для абслугоўваньня чырвонаармейскіх часьцей у час манэўраў.

Да груп таксама прымацаваны музыкальна-вакальныя сілы.

* * *

Прэзыдыум Белбюро ЦК чыгуначнікаў адпусьціў 300 рублёў на набыцьцё падарункаў чырвонаармейцам удзельникам манэўраў.

На прадпрыёмствах ідзе падрыхтоўка да ўрачыстай сустрэчы гасьцей.

Арганізацыя буйных малочных фэрмаў.

У мэтах забесьпячэньня гарадоў малаком і малочнымі прадуктамі Белсельтрэст высоўвае думку арганізацыі пры найбольш буйных прамысловых асяродках вялікіх малочных фэрмаў. Усяго праектуецца арганізацыя 10-ці МАЛОЧНЫХ ФЭРМАЎ, што павінна каштаваць 1,5 мільёнаў руб. Арганізацыя гэтых фэрмаў мае распачацца з наступнага гаспадарчага году.

Праект Белсельтрэсту знаходзіцца на разгледжаньні вышэйшых урадавых органаў.

Праверка выкананьня дагавораў па сац. спаборніцтву.

Прэзыдыум ЦСПСБ даручыў акрпрафбюро і АТЭ ЦСПСБ правесьці шырокія нарады прафактыву, на якіх паставіць інструкцыйны даклад аб значэньні праверкі гаспарарча-палітычных дагавораў, а таксама аб падрыхтоўцы да заключэньня новых дагавораў па сац. спаборніцтву па наступны год.

Уся праца па праверцы выкананьня дагавораў павінна праводзіцца пры актыўным удзеле камсамолу.

На месцы выяжджае 10 чалавек адказных працаўнікоў ЦП саюзаў ЦСПСБ для аказаньня практычнай дапамогі ў правядзеньні масавай праверкі выкананьня гасп.-паліт. дагавораў па прадпрыёмствах.

Дадзены ўказаньні ход праверкі высьвятліць у друку, асабліва ў завадзкіх і насьценных газэтах.

На месцы выехалі шэраг адказных працаўнікоў ЦСПСБ.

Адказныя працаўнікі ЦСПСБ выехалі ў Воршу, Віцебск, Гомель і Бабруйск для правядзеньня дакладаў аб выніках абсьледваньня ЎсеЦСПС прафсаюзнай працы ў БССР.

Асноўная задача выязду—мабілізаваць увагу прафсаюзных мас на зьмяненьні мэтадаў і тэмпу прафсаюзнай працы.

Удзел прафсаюзаў у месячніку барацьбы з бяспрытульнасьцю.

Прэзыдыум ЦСПСБ абгаварыў пытаньне аб удзеле прафсаюзаў у месячніку па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю.

Вырашана скарыстаць усе сходы членаў прафсаюзаў для абгаварэньня пытаньня аб дапамозе дзецям і ўдзеле ў кампаніі па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю.

У клюбах на карысьць месячніка будуць наладжвацца вечары і спэктаклі.

Прафарганізацыі павінны разам з дзяржаўнымі і грамадзкімі ўстановамі прыступіць да сыстэматычнага ўдзелу ў справе барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю.

Папулярызацыя пяцігодкі сярод сэзонных рабочых.

ЦП саюзу будаўнікоў выдае спэцыяльную брашуру ў ліку 5000 экз., якая папулярызуе 5-цігодку разьвіцьця народнай гаспадаркі БССР, а таксама адбівае ўсе пытаньні бягучага палітычнага моманту.

Брашура будзе раздадзена рабочым-сэзоньнікам пры ад'езьдзе іх па дамох.

Новае школьнае будаўніцтво.

Паводле пляну НКА БССР у навучальным годзе на Беларусі будавацца 481 новая 2 кампл. школы. пабудову кожнай школы адпушчана 11200 руб.

Лесаматар'ял для будаўніцтва адпускацца акрвыканкомамі па таксе.

Прыём дзяцей рабочых у пэдтэхнікумы працы.

У мэтах большай пралетарызацыі тэхнікумаў, у Наркамасьветы прыём заяў ад дзяцей рабочых, якія будуць накіраваны у слаўскі, Полацкі, Рэчыцкі і пэдагагічныя тэхнікумы.

Усім залічаным будзе выдавацца пэндыя і яны будуць забясьпечаны тэрнатамі.

Падрыхтоўка тэхнічных цаўнікоў для апарату сувязі.

З 15-га кастрычніка пры Менскім канторы адчыняюцца курсы падрыхтоўцы малодшага тэхнічнага персаналу для апарату сувязі.

Курсы разьлічаны на 2 зімовы сэзон. Будзе прынята 30 чал.

Клюб працаўнікоў масьтацтва.

Згодна рашэньня прэзыдыуму Белпрацмастацтва ў Менску на Ленінкаўскай вуліцы адчыняецца агітрадзкі клюб для працаўнікоў мастацтва. Ідзе будзе сканцэнтравана ўся культурна-асьветная праца сярод сяброў саюзу мастацтва.

Пасяджэньне прэзыдыуму саюзу друкароў на прадпрыёмстве.

ЦП саюзу друкароў наладжвае пасяджэньне прэзыдыуму ў памяшканьні 1-й дзяржаўнай друкарні, каб з рабочымі абгаварыць шэраг важных пытаньняў.

Паміж іншым пытаньнямі будуць абгаворваны: аб пэрспэктывах забясьпечэньня паперай беларускага рынку, прыемствах паліграфвытворчасьці, будове тыпізаванай друкарні і інш. аб праверцы выкананьня заключаных дагавораў па сацыялістычнаму спаборніцтву.

Апавяшчэньні.

14-га верасьня а 2-й гадзіне дню ў памяшканьні Рабфаку оклікаецца сход таварышоў камандыраваных у Хэмфак БДУ у лік „25-ці" з наступнаю абвесткай дню.

1. Інфармацыя тав. **КАРАНЕЎСКАГА.**

2. Аб вучэбным пляне курсаў па падрыхтоўцы—т. **ЛОЙКА.**

3. Выбары старастата.

Па ўсім справам, якія датычыцца курсаў зьвяртацца да тав. Варончанка.

АПАД ЦК КП(б)Б.

Да ведама ўсіх АК і РК ЛКСМБ, а таксама паступаючых на курсы КСМ антыву. 15-верасьня іспыты і афармленьне прыёму на курсы КСМ актыву заканчываюцца. Не накіравалі на іспыты: 1. Менскі АК ЛКСМ—7 асоб, Гомельскі—ні аднаго, Віцебскі—4, Бабруйскі—7, Аршанскі—4, Полацкі—ні аднаго, Мазырскі—2.

Вышэй пералічаным АК і РК КСМ прапануецца выслаць камандыраваных т. т. не пазьней 15-га г. м.

Жадаючыя паступіць у парадку вольнага прыёму павінны прыбыць 13—14 г. м. з усімі дакумэнтамі і Комвуз, Унівэрсытэцкая 27.

ДОМ АСЬВЕТЫ.—Сёньня 13-IX а 7 гадз. увечары Ц. П. Саюзу і асьветы склікае сход асьветнікаў гор. Менску з наступным парадкам:

Даклад т. **ГЕРШАНБАУМА** аб вішчы і чарговых задачах працы асьветных устаноў.

Да ведама рабочых і раб

З гэтага году ў Менску адчы 5 двохгадовых вячэрніх школ 1-й для рабочых (замест школ для м менных). Школы будуць даваць 4 групы сямігодні і падрыхтоўваць чых у вячэрнія школы ўзвышанага Прыём заяў з 15 да 25 верасьня. зьмяшчаюцца: а) беларускія: № 1 нальная вул. у памяшканьні 13-й годні, № 2—Падгорны завулак, 8, Міхайлаўская. 4, б) яўрэйскія: № Герцэна—4 і № 5—Рэвалюцыйная

У школы прымаюцца ў 1-ую асобы ўладаючыя ведамі ў аб'ёму грамы ліквпункту (умеючыя чытаць, і ведаючыя 4 арытмэтычных дзе 2-ую—скончыўшыя школы для м менных.

Часова выкон. абавязкі адказнага рэдактара П. ШАСТАК

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 13-е ВЕРАСЬНЯ 1929 г.

	Куп.	Прад
1 6 проц. выйгр. паз.	4.91	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	126.70	128.70
Выйгр. пазыка 1929 г.	102.10	102.50
10 проц. выйгр. паз. 1927 г.	25.27	25.37
3-я сялянск. выйгр. паз. 1927 г.	5.03,5	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.37	10.72
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.72	25.82
2 „ „ „ проц.	25.45	25.55
„ „ „ б-проц.	25.81	25.91
11проц. дзярж. паз. 28 г.	100.34	100.39
21 проц. рэнтная пазыка 1927 г.	103.34	—

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.
ГАСТРОЛІ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ
Пятніца, 13-га верасьня. Прэм'ера
„ХОЛОПКА" у 3-х дзеях Стрэльнікава.
Пачатак а 8 з пал. гадзіне.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». Ад панядзелка 9 верасьня Ксенія Дэсьні у бліскучай камэдыі вытворчасьці „УФО" НЯВЕСТА БОКСЭРА

КІНО-САД «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Савецкая № 71. Ад аўторка 10 верасьня—НОВЫ БЫТАВЫ ФІЛЬМ „НЕ ПО ПУТИ" (УКЛОН) маст. быт. драма. рэж. М. Цярэшчанка. У галоўных ролях: В. Ванін, Сміранін, К. Куранін. ЗВЫШ ПРАГРАМЫ—ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ВЯДОМАГА САТЫРЫКА ЛЬВА БРАУНА зусім новы рэпэртуар. ПАЧАТАК І-га СЭАНСУ А 8 Г. 30 ХВ.—КАСА З 7 ГАДЗ.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА". Ад панядзелка 9-га верасьня буйны гістарычны фільм „Джанкі" У 7 ЧАСТКАХ.

1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР". Ад панядзелка 9 верасьня новы фільм БЯСПРЫТУЛЬНЫЯ. Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дню. Пачатак 1-га сэансу а 3 гадз. 30 хв., 2-га а 5 гадз. ПА НЯДЗЕЛЯХ кіно адчынена ад 12 гадз. дню. Цана білету 10 кап. Месцы нумараваныя.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ Ад панядзелка 9-га верасьня па прычыне вялікага посьпеху 2-гі тыдзень ПАТ І ПАТАШОН у замежным фільме. СІЛА і ХАРАСТВО арыгінальная камэдыя ў 6 частках. ПАЧАТАК 1-ГА СЭАНСУ А 7 З ПАЛ. ГАДЗ. УВЕЧАРЫ. Каса адчынена ад 6 гадз.

УВАГА! ПА ПАНЯДЗЕЛКАХ Кіно-тэатры Белдзяржкіно „КУЛЬТУРА", „ПРАЛЕТАРЫ", „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" і „ЮНЫ ПІАНЭР" АДКРЫТЫ. Зьмена карцін па ПАНЯДЗЕЛКАХ.

УЗЬДЗ